ЦБС г. Гродно
ДЗЯРЖАЎНАЯ ЎСТАНОВА КУЛЬТУРЫ
«ЦЭНТРАЛІЗАВАНАЯ БІБЛІЯТЭЧНАЯ СІСТЭМА Г. ГРОДНА»
ГРОДЗЕНСКАЯ ГАРАДСКАЯ ЦЭНТРАЛЬНАЯ БІБЛІЯТЭКА ІМЯ А. МАКАЁНКА
АДДЗЕЛ БІБЛІЯТЭЧНАГА МАРКЕТЫНГУ

# ЁН ПЕРШЫ КНІГУ ДАЎ СЛАВЯНАМ



## МЕТАДЫЧНЫЯ ПАРАДЫ Ў ДАПАМОГУ АРГАНІЗАЦЫІ МЕРАПРЫЕМСТВАЎ ДА 500-ГОДДЗЯ БЕЛАРУСКАГА КНІГАДРУКАВАННЯ

2017

Дзяржаўная ўстанова культуры
«Цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма г. Гродна»

Гродзенская гарадская цэнтральная бібліятэка імя А. Макаёнка
Аддзел бібліятэчнага маркетынгу

# ЁН ПЕРШЫ КНІГУ ДАЎ СЛАВЯНАМ

метадычныя парады ў дапамогу арганізацыі мерапрыемстваў
да 500-годдзя беларускага кнігадрукавання

2017

Ён першы кнігу даў славянам : метадычныя парады ў дапамогу арганізацыі мерапрыемстваў да 500-годдзя беларускага кнігадрукавання / ДУК «Цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма г. Гродна», Гродзенская гарадская цэнтральная бібліятэка імя А. Макаёнка, аддзел бібліятэчнага маркетынгу; уклад. А. С. Рубель; рэд. Н. Ю. Наземцава. – Гродна, 2017– 50 с.

Выданне змяшчае метадычныя і бібліяграфічныя матэрыялы для выкарыстання пры арганізацыі выстаў і правядзенні інфармацыйна-масавых мерапрыемстваў да 500-годдзя беларускага кнігадрукавання ў бібліятэках.

Адрасавана бібліятэчным спецыялістам.

У 2017 годзе наша краіна адзначае вялікую дату – **500-годдзе беларускага кнігадрукавання**. Гэты юбілей, безумоўна, звязаны з дзейнасцю славутага **Францыска Скарыны**.



Выдатны дзеяч беларускай культуры эпохі Адраджэння здолеў праявіць сябе як першадрукар, выдавец, рэдактар і перакладчык біблейскіх зводаў, аўтар арыгінальных прадмоў і каментарыяў да кніг Святога Пісання і іншых выданняў, які ўнёс неацэнны ўклад у многія сферы мастацкай і навуковай творчасці. У яго дзейнасці ярка адбіліся гуманістычныя, асветніцкія і дэмакратычныя тэндэнцыі, павевы еўрапейскага Адраджэння, культурныя сувязі з Расіяй, Украінай і іншымі краінамі. Францыск Скарына, які стаяў ля вытокаў нацыянальнай беларускай культуры, з'яўляецца яе сімвалам.

У 2017 годзе Дзень беларускага пісьменства пройдзе 3 верасня на радзіме Францыска Скарыны ў горадзе Полацку Віцебскай вобласці.

Дзень беларускага пісьменства ў бягучым годзе асаблівы, паколькі гэта год 500-годдзя беларускага кнігадрукавання і год 1155-годдзя Полацка.

Полацк прымае свята ўжо трэці раз. Знакавыя падзеі сталі вызначальнымі ў выбары месца правядзення мерапрыемства.



# АД ПОЛАЦКА ПАЧАЎСЯ СВЕТ…

**Полацк** – буйны горад у Віцебскай вобласці Беларусі, адміністрацыйны цэнтр Полацкага раёна, знаходзіцца на рацэ Заходняя Дзвіна пры ўпадзенні ў яе ракі Палаты. У 100 км ад Віцебска. Вузел чыгунак, лініі на Маладзечна, Віцебск, Невель (Расія), Даўгаўпілс (Латвія) і аўтамабільных дарог. Насельніцтва – 85 078 чалавек (па дадзеных 2016 года). Знаходзіцца непадалёк ад Наваполацка, разам з якім складае Полацкі рэгіён.

Тапонім «Полацк» утварыўся ад імя ракі Палата. У сваю чаргу назва рэчкі, мае балцкае паходжанне ад асноў «pal» або «palte» – балота, лужына, з далейшай славянскай асіміляцыяй. У старабеларускіх пісьмовых помніках назва горада зафіксавана ў формах Полоцк, Полоцъкъ, Полотскъ, Полотескъ, Полтескъ, Плтескъ, Полческъ, у нямецкіх хроніках Плоцэке, у скандынаўскіх сагах Pallteskiuborg, Palteskia.

Упершыню Полацк згадваецца ў «Аповесці мінулых гадоў» пад 862 годам. Звычайна першую згадку Полацка звязваюць з паведамленнем: «В лето 6370 [862] и прия власть Рюрик, и раздал мужем своим грады, овому Полотеск, овому Ростов, другому Белоозеро…».

У 9 ст. Полацк размяшчаўся на гарадзішчы на правым беразе Палаты. Хуткаму развіццю горада спрыяла яго выгаднае размяшчэнне на гандлёвым шляху з Рыжскага заліва да Кіева і Чорнага мора, праз вярхоўі Заходняй Дзвіны і Волгі да краін Усходу (частка шляхоў з варяг у грэкі і з вараг у арабы). У 10 – 13 стст. быў цэнтрам Полацкага княства. У 11 ст. на тэрыторыі сённяшняга Верхняга замка пабудаваны Полацкі Сафійскі сабор. У 12 ст. сфарміравалася самабытная школа дойлідства, пабудаваныя Полацкі княжацкі храм і княжацкі палац, Бельчыцкі Барысаглебскі манастыр, заснаваны Полацкія Спаскі і Багародзіцкі манастыры і інш. У 12 ст. тут працавалі майстар-ювелір Лазар Богша (стварыў крыж Еўфрасінні Полацкай) і дойлід Іаан, які пабудаваў Полацкую Спаскую царкву. З сярэдзіны 13 ст. Полацк знаходзіўся ў складзе Вялікага княства Літоўскага, самы вялікі яго горад у 14 – 16 стст., меў адмысловыя правы («Полацкія прывілеі»). Тут былі створаныя Полацкія Евангеллі 12–14 стст., у горадзе пры Сафійскім саборы з 11 ст. існавала бібліятэка. Каля 1490 г. у Полацку нарадзіўся знакаміты дзеяч культуры эпохі Адраджэння Францыск Скарына. У 1498 г. Полацк атрымаў магдэбургскае права. З 1504 г. быў цэнтрам Полацкага ваяводства. З 16 ст. горад меў свой герб. Падчас вайны 1654 – 1667 гг. Полацк быў заняты рускімі войскамі, паводле



Андрусаўскага перамір'я (1667 г.) – вернуты Рэчы Паспалітай. У канцы 17 –

пачатку 18 ст. прыйшоў у заняпад. У 1772 годзе да Расіі адыйшла правабярэжная, у 1793 – левабярэжная частка горада. З 1776 года Полацк быў цэнтрам Полацкай губерніі, з 1796 г. – цэнтрам павета Беларускай губерніі, з 1802 г. – Віцебскай. У 1924 годзе Полацк быў цэнтрам раёна, у 1924 – 1930 гг. і 1935 – 1938 гг. – цэнтрам акругі. З 1938 года знаходзіўся ў складзе Віцебскай вобласці. У 1944 – 1954 гг. быў цэнтрам Полацкай вобласці. У 1989 годзе Полацк стаў першым у Беларусі гісторыка-культурным горадам-запаведнікам.

14 студзеня 2013 указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь за № 27 «Аб аб'яднанні раёнаў і гарадоў абласнога падпарадкавання Рэспублікі Беларусь, якія маюць агульны адміністрацыйны цэнтр» Полацк быў пазбаўлены статусу горада абласнога падпарадкавання.

***

На сённяшні дзень Полацк з’яўляецца духоўнай сталіцай Рэспублікі Беларусь, цэнтрам зараджэння беларускай дзяржаўнасці, бо менавіта з гэтага горада пачаўся адлік беларускага радаводу, культуры.

Сучасны Полацк знаходзіцца ў пастаянным руху, развіваецца…

Полацк – прызнаны гістарычны цэнтр. Больш за 40 аб’ектаў, уключаных у Дзяржаўны спіс гісторыка-культурнай спадчыны, знаходзяцца ў Полацку. І гэты спіс увесь час папаўняецца.

У горадзе ўстаноўлены помнікі беларускаму першадрукару Францыску Скарыне, асветніцы Еўфрасінні Полацкай і паэту Сімяону Полацкаму, полацкім князям Усяславу Брачыславічу і Андрэю Альгердавічу, свяціцелю Мікалаю Цудатворцу, дойліду Іаану.

У горадзе ўсталяваны таксама памятныя знакі «Геаграфічны цэнтр Еўропы» і літары «Ў», садова-паркавыя скульптуры «Полацкі купец» і «Шалі».

Полацк – той горад, дзе да гісторыі можна дакрануцца рукой…

Горад, дзе кожны жыхар з гонарам кажа: «Я – палачанін», і ў гэтым старaславянскім слове – тысячагадовая сувязь з продкамі, са сваёй зямлёй, са сваёй краінай.

Полацк – буйны культурны цэнтр. Менавіта ў Полацку знаходзіцца адзін з лепшых, Нацыянальны Полацкі гісторыка-культурны музей-запаведнік – сапраўдны, жывы, яркі, з выстаўкамі сусветнага ўзроўню! Ён аб’ядноўвае музеі, што адлюстроўваюць спадчыну і багацце полацкай зямлі: беларускага кнігадрукавання, дзіцячы, краязнаўчы, традыцыйнага ткацтва Паазер’я, прыродна-экалагічны, баявой славы, «Домік Пятра І», музей-бібліятэку Сімяона Полацкага, Мастацкую галерэю, Сафійскі сабор.

Жыхары і госці горада маюць магчымасць наведаць стаўшыя ўжо традыцыйнымі міжнародныя фестывалі, якія праходзяць у Сафійскім саборы.

Дасягненні ў сферы культуры і мастацтва садзейнічаюць умацаванню аўтарытэту Полацка ў рэспубліцы і на міжнародным узроўні.

У Полацку размяшчаецца гісторыка-філалагічны факультэт Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта (астатнія — ў Наваполацку). Працуюць Полацкі дзяржаўны лясны каледж, Полацкі дзяржаўны аграрна-эканамічны каледж і Полацкі гандлёва-тэхналагічны каледж.

Сёння Полацк – адзін з лепшых гарадоў Віцебшчыны. Яго жыхары ўсведамляюць, што падтрымліваць статус можна і трэбна кожны дзень, кожны год, прад'яўляючы патрабаванні самага высокага парадку. Палачане любяць свой горад, паважаюць яго гісторыю, культуру, шануюць духоўную спадчыну, пакінутую ім продкамі.

## ГІСТАРЫЧНАЯ ПАМЯЦЬ НАРОДА

Горад Полацк – самы старажытны горад Беларусі. На мяжы першага і другога тысячагоддзяў Полацк быў сталіцай аднайменнага княства – першай беларускай дзяржавы. У горадзе захавалася шмат архітэктурных помнікаў. Адной з асноўных славутасцяў Полацка з'яўляецца будынак Сафійскага сабора – самы старажытны помнік манументальнай архітэктуры ў Беларусі, што ў 11 стагоддзі ўзвёў полацкі князь Усяслаў Брачыславіч.

**Сафійскі сабор** быў пабудаваны ў Полацку паміж 1044 і 1066 гадамі. Па некаторых звестках, на момант сваёй пабудовы сабор быў першым і адзіным каменным будынкам на тэрыторыі сучаснай Беларусі.



Да канца 16 стагоддзя храм функцыянаваў і быў праваслаўным. Пасля падпісання Брэсцкай уніі ў 1596 годзе сабор перайшоў да уніятаў. Пасля пажару і частковага разбурэння ў 1607 годдзе ён некаторы час знаходзіўся ў запусценні. Але ў 1618 годзе сабор быў адноўлены і часткова перабудаваны. У 1642 годзе храм зноў пацярпеў ад пажару, але зноў быў адноўлены. Падчас руска-польскай вайны Полацк быў узяты рускімі войскамі, таму з 1654 і да 1667 года Сафійскі сабор быў праваслаўным, а затым зноў перайшоў да уніятаў. Аднак, падчас Паўночнай вайны 1700-1721 гадоў у прытворы храма па загадзе цара Пятра I размясцілі парахавы склад, які 1 мая 1710 года выбухнуў, пасля чаго Сафійскі сабор быў цалкам разбураны і праляжаў у руінах да 1738 года.

Пасля гэтага, на падмурках Сафійскага сабора, якія захаваліся ў стылі віленскага барока пабудавалі абсалютна новы храм, які ўяўляў з сябе двухвежавую базіліку. Узвядзенне новага сабора было скончана ў 1750 годзе. Зноў пабудаваны храм быў уніяцкім. Менавіта такім ён і дайшоў да нашых дзён. Падчас Айчыннай вайны 1812 года храм выкарыстоўваўся французскімі войскамі як стайня. У далейшым – пуставаў. У 1839 годзе храм быў вернуты праваслаўным. У 1911 – 1914 гады быў праведзены капітальны рамонт сабора. У 1924 годзе ў рамках савецкай атэістычнай палітыкі царкву закрылі і размясцілі ў ёй краязнаўчы музей. У перыяд нямецкай акупацыі з 1942 па 1944 год Сафійскі сабор быў дзеючым, а потым быў зноў зачынены.

З канца 1969 да 1983 года ў саборы праводзіліся рэстаўрацыйныя і архітэктурна-археалагічныя даследаванні. Пасля іх заканчэння ў будынку храма быў адкрыты музей гісторыі архітэктуры Сафійскага сабора і канцэртная зала камернай і арганнай музыкі. У 1985 годзе ў саборы быў збудаваны арган. Першы канцэрт быў дадзены 2 мая 1985 года.

Сёння сабор знаходзіцца ў выдатным стане. Гэты храм уваходзіць у склад Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка. Яго наведвае шмат турыстаў. Адзін раз у год, 5 чэрвеня, у дзень памяці Святой Еўфрасінні Полацкай, тут праходзіць праваслаўнае набажэнства. Затым ад Сафійскага сабора да Спаса-Еўфрасіннеўскага манастыра праходзіць хрэсны ход.

Ад арыгінальнага Сафійскага сабора 11 стагоддзя захаваліся элементы падмурка, якія даступны да агляду ў ніжняй частцы будынка, а таксама апсіда вышынёй каля 9-ці метраў з правага боку сабора – самае старажытнае збудаванне на тэрыторыі Беларусі, з ліку тых, што захаваліся да нашых дзён. Побач з Сафійскім саборам у Полацку размясціўся **Барысаў камень** з надпісамі 12 стагоддзя. Раней ён знаходзіўся каля в. Падкасцельцы, за 5 км ад Полацка, на правым беразе Заходняй Дзвіны. Камень-валун (палявы шпат чырванаватага колеру) мае памер каля 8 м у акружнасці, паверхня яго няроўная. На камені высечаны шасціканцовы крыж (даўжыня больш за 1,5 м) і надпісы «ХС НИКА» і «Господи помози рабу своему Борису». Крыж быў высечаны паводле загаду полацкага князя Барыса Усяславіча ў 12 стагоддзі ў сувязі з ажыўленнем язычніцкіх вераванняў і з мэтай увекавечыць імя князя. У народзе камень вядомы пад назвамі Барыс, Барыс-Хлебнік, Барыс-Глеб, Барысаглебскі.



Важнай славутасцю горада Полацка з'яўляецца **комплекс будынкаў Спаса-Еўфрасіннеўскага жаночага манастыра**. Гэты манастыр быў



заснаваны самой Еўфрасінняй Полацкай ў 1125 годзе. Найбольш важным архітэктурным, культурным і гістарычным помнікам манастыра з'яўляецца Спаса-Праабражэнская царква пабудаваная паміж 1152 і 1161 гадамі дойлідам Іаанам. Гэты невялікі храм быў узведзены пад кіраўніцтвам Святой Еўфрасінні Полацкай. Да нашых дзён выдатна захаваўся арыгінальны будынак 12 стагоддзя, унутры якога – асабістая келля Прападобнай і арыгінальныя фрэскі. Таксама ў склад манастыра ўваходзяць і іншыя каштоўныя архітэктурныя помнікі. Цэнтральны храм манастыра – Крыжаўзвіжанскі сабор пабудаваны ў 1897 годзе. Брама-званіца і яшчэ адна невялікая царква пабудаваныя тут у канцы 19 стагоддзя. Адзін з манастырскіх карпусоў ўзвялі ў пачатку 18 стагоддзя. Іншыя пабудаваны пазней, у 1902 годзе і ў 1990-ых гадах.

Ад моманту свайго заснавання і да канца 16 стагоддзя манастыр заставаўся праваслаўным і дзеючым. У 1579 годзе Полацк быў узяты Стэфанам Баторыем і ўвайшоў у склад Рэчы Паспалітай. Пасля гэтага ў 1580 годзе манастыр быў аддадзены езуітам. У 1654 годзе вернуты ў праваслаўе. У 1667 году зноў трапіў у рукі езуітаў, у падпарадкаванні якіх заставаўся да 1820 года. Затым езуіты пакінулі Полацк. Але яшчэ некаторы час манастыр заставаўся каталіцкім, ён быў перададзены ордэну піяраў. У 1832 годзе, пасля паражэння адпаведнага паўстання, кляштар быў вернуты праваслаўным і да 1840 года поўнасцю адноўлены. Далей манастыр працягваў функцыянаваць і пашырацца аж да пачатку 20 стагоддзя.

У 1915 годзе, падчас Першай Сусветнай Вайны жыхаркі манастыра і царкоўныя каштоўнасці былі эвакуіраваны углыб Расіі. У 1921 годзе манастыр аднавіў працу ў Полацку, аднак, у 1925 годзе быў канчаткова зачынены. У 1943 годзе, у час Другой Сусветнай Вайны, акупацыйныя ўлады далі дазвол на аднаўленне працы манастыра. Пасля гэтага было пачата адраджэнне абіцелі. Ужо ў савецкі час, у 1961 годзе манастыр зноў быў зачынены, а яго цэнтральны храм стаў звычайным парафіяльным, але працягваў функцыянаваць.

Чарговае рашэнне аб аднаўленні работы манастыра было зноў прынята ў 1989 годзе. У 1990 годзе пасля правядзення некаторых аднаўленчых і рэстаўрацыйных работ манастыр зноў быў адчынены. З тых часоў і да нашых

дзён ён бесперапынна функцыянуе. Сюды прыязджае шмат турыстаў і паломнікаў. Усе будынкі, храмы і іншыя архітэктурныя помнікі, якія адносяцца да манастыра ў нядаўні час былі адрэстаўраваны і зараз знаходзяцца ў добрым стане.

Са Спаса-Еўфрасіннеўскім жаночым манастыром ў Полацку звязаныя дзве буйныя праваслаўныя святыні. Мошчы Святой Еўфрасінні Полацкай цяпер захоўваюцца менавіта ў гэтым манастыры. З канца 12 стагоддзя і да пачатку 20 стагоддзя мошчы Святой захоўваліся ў Кіеве. У 1910 годзе былі перанесены ў Полацк. У перыяд з 1920 і да 1943 года мошчы Святой часта ўскрывалі, перамяшчалі, выстаўлялі ў розных храмах і музеях. І нарэшце, у 1943 годзе, адначасова з аднаўленнем працы манастыра, туды былі вернуты і мошчы Святой Еўфрасінні Полацкай. Да нашага часу яны застаюцца ў Полацку.

Па-другое, у манастыр Прападобная Еўфрасіння ў 1161 годзе ахвяравала пазалочаны напрастольны крыж, які пазней атрымаў назву – Крыж Еўфрасінні Полацкай. Ён уключаў часціцы мошчаў шматлікіх святых і Жыватворчага Крыжа Хрыстовага. Крыж быў выразаны мясцовым майстрам-ювелірам Лазарам Богшам. У 13 стагоддзі Крыж быў вывезены з Полацка ў Расію, аднак зноў вернуты ў манастыр Іванам Грозным у 1563 годзе. У 1925 годзе Крыж быў канфіскаваны з абіцелі савецкімі ўладамі. У 1941 годзе падчас Вялікай Айчыннай Вайны Крыж Еўфрасінні Полацкай бясследна знік і да гэтага часу не знойдзены. У 1997 годзе была выраблена дакладная копія Крыжа Еўфрасінні Полацкай. Адноўлены Крыж цяпер знаходзіцца ў манастыры ў Полацку.



Наступнай важнай славутасцю Полацка з'яўляецца **комплекс будынкаў Богаяўленскага мужчынскага манастыра**. Цэнтральны храм гэтага манастыра – Богаяўленская царква. Яна была пабудаваная ў 1779 годзе. У наш час храм добра адрэстаўрыраваны. Манастырскія карпусы, якія адносяцца да гэтай абіцелі нават больш старадаўнія, яны ўзведзены у 17 стагоддзі. У сучасны час таксама знаходзяцца ў добрым стане. Ёсць меркаванне, што ў адным з карпусоў гэтага манастыра некаторы час жыў Сімяон Полацкі.





Цікавай славутасцю Полацка з'яўляецца **комплекс будынкаў былога калегіума і кляштара Езуітаў**. Будынкі, якія ўваходзяць у склад архітэктурнага комплексу ўзводзіліся ў Полацку з 1750 па 1835 гады. Яшчэ нядаўна большасць будынкаў комплексу ўяўлялі з сябе руіны. Але на сённяшні дзень іх аднавілі. Таксама ў склад дадзенага архітэктурнага комплексу некалі ўваходзіў велізарны і прыгожы храм – Касцёл Святога Стэфана (з 1830 года – Мікалаеўскі сабор), які быў узведзены ў 1738 годзе, а ў 1964 годзе ён быў узарваны і цалкам разбураны. Ад гэтага храма засталася толькі карціна на фасадзе аднаго з будынкаў Полацка, які стаяў насупраць разбуранага храма.

У горадзе Полацку ёсць яшчэ некалькі храмаў розных хрысціянскіх канфесій. Так, касцёл Святога Андрэя Баболі быў пабудаваны зусім нядаўна, у 1997 годзе. Іншы храм – Пакроўская царква, таксама быў узведзены не так даўно – у 1990 годзе. Ёсць у горадзе і храм не зусім уласцівы для Беларусі, а менавіта – Лютэранская кірха, пабудаваная ў 1888 годзе. Зараз у будынку кірхі размясціўся краязнаўчы музей.

Цікавай славутасцю горада Полацка з'яўляецца **мураваны жылы дом 1694 пабудовы**. Будынак старадаўні, але з архітэктурнага пункту гледжання, ён не вельмі прыкметны. Тым не менш, некаторай каштоўнасці гэтаму будынку дадаюць здагадкі пра тое, што менавіта тут у час сваіх візітаў у Полацк размяшчаўся цар Пётр I.



У Полацку было шмат іншых манастыроў і храмаў. На жаль, далёка не ўсе яны захаваліся да нашых дзён. Некаторыя з іх сёння ўяўляюць сабой руіны, а іншыя разбураны да самай асновы. На іх месцы зараз можна ўбачыць толькі памятныя знакі.

Многія архітэктурныя помнікі горада маляўніча размешчаны на прыгожых берагах рэк Палаты і Заходняй Дзвіны. Гістарычны цэнтр Полацка прыгожа добраўпарадкаваны. У горадзе ёсць усе неабходныя аб'екты турыстычнай інфраструктуры, якія робяць Полацк вельмі прывабным і адным з найважнейшых турыстычных напрамкаў для падарожнікаў па Беларусі.

# ПОСТАЦІ ДАЛЁКАЙ МІНУЎШЧЫНЫ:
## помнікі беларускім асветнікам у Полацку

*Новы дзень прыйдзе, і новыя людзі*
*Будуць пачатую думку снаваць.*
***Янка Купала***

Праз смугу стагоддзяў, увекавечаныя ў мемарыяльных помніках, паўстаюць перад намі велічныя постаці сыноў і дачок беларускага народа, якія пакінулі важкі след у яго гісторыі і культуры. Сваімі справамі яны ўславілі Беларусь, назаўсёды стаўшы людзьмі-легендамі. Сярод іх знакамітыя ўраджэнцы Полацкай зямлі – асветніца Еўфрасіння Полацкая, паэт Сімяон Полацкі, першадрукар, асветнік, гуманіст Францыск Скарына і яшчэ шмат выдатных асоб. Аб іх жыцці і справах на карысць Бацькаўшчыны мы ведаем са старонак старажытных летапісаў, мяркуем па спадчыне, якую яны пакінулі.

Славутая палачане заслужылі добрую памяць і ўшанаванне за сваю ахвярнасць і самаадданасць народу. Культурныя дзеячы мінулага былі высакароднымі, моцнымі духам і адважнымі людзьмі. Яны выдавалі кнігі, будавалі храмы, зберагалі і ўзбагачалі спадчыну беларусаў, далі пачатак нашай гісторыі. Мы павінны помніць пра іх, бо ў гэтых каранях і вытоках – наша сучаснасць і будучыня. Так, у Полацку памяць пра нашых продкаў увекавечана ў мемарыяльных помніках.

## Помнік Францыску Скарыне



Помнік беларускаму асветніку, навукоўцу, перакладчыку, першадрукару Францыску Скарыну – ураджэнцу Полацка, быў установлены ў 1974 годзе. Аўтары скульптуры – Аляксей Глебаў, Ігар Глебаў і Андрэй Заспіцкі. Вышыня бронзавага помніка складае 12 метраў, вышыня самой скульптуры – 5 метраў 50 сантыметраў. Скульптура выразная па кампазіцыі і змесце, манументальна-велічная па форме. Аўтары адлюстравалі Скарыну ў мантыі вучонага з кнігай у руках – сімвалам вучонасці. Свабодныя глыбокія зморшчыны мантыі падкрэсліваюць дынаміку руху, пластыку фігуры першадрукара. Твар яго выказвае глыбокую задуменнасць.

Францыск Скарына нарадзіўся ў 1490 годзе ў Полацку. Ад бацькоў ён пераняў любоў да гэтага горада і пазней заўсёды гаварыў пра Полацк з

эпітэтам «слаўны». Цяга да ведаў прымусіла Скарыну пакінуць родны горад. Яму давялося наведаць Кракаў, Падую, Прагу, Вільню...

Найбольш важкі ўклад, за які Францыска Скарыну шануюць на радзіме, – заснаванне першай друкаванай майстэрні на тэрыторыі Беларусі, кнігадрукаванне і першыя пераклады Біблії на беларускую мову (усяго ён зрабіў 23 пераклады і перавыданні гэтай кнігі). Частка прадмоў да кніг змяшчае рыфмаваныя прадмовы самога Скарыны, што дазваляе аднесці яго да заснавальніка пісьмовай паэзіі. Таксама яго наваўвядзеннем было ілюстраванне кніг гравюрамі.

Францыск Скарына пражыў доўгае і яркае жыццё, пакінуўшы вялікі след у гісторыі. Сёння, кнігі Скарыны захоўваюцца ў вядомых бібліятэках Лондана, Прагі, Вільні...

Помнікі, устаноўленыя ў гонар вялікага асветніка Сярэднявечча, ўпрыгожваюць не толькі беларускія гарады Полацк і Мінск, але і еўрапейскія – Кракаў, Падую, Прагу. Помнікі Скарыне ўстаноўлены па ўсім свеце, але менавіта скульптура ў Полацку лічыцца самай дакладнай і вядомай.

## Помнік Еўфрасінні Полацкай



28 верасня 2000 года быў устаноўлены помнік Еўфрасінні Полацкай выдатнай асветніцы Полацкага княства і Усходняй Русі. Помнік адкрыты ў горадзе, дзе яна нарадзілася, вырасла і нябеснай апякункай якога стала.

Еўфрасіння Полацкая – княгіня, першая жанчына на Русі, якая была кананізавана ў святыя. Яе свецкае імя – Прадслава. Па дасягненні паўналецця, яна сышла ў манастыр. З блаславення полацкага епіскапа Іллі манашка, цяпер ужо Еўфрасіння, пасялілася ў келлі Полацкага Сафійскага сабора. Там у храмавым скрыпторыі яна перапісвала і, магчыма, перакладала кнігі.

Еўфрасіння заснавала жаночы Полацкі Спаса-Еўфрасіннеўскі манастыр і мужчынскі манастыр, якія сталі сапраўднымі цэнтрамі адукацыі ў Полацкім княстве. Пры іх працавалі школы (выкладалі чытанне, пісьмо, нотную грамату, магчыма, грэчаскую мову), бібліятэкі, скрыпторыі, верагодна, іканапісныя і ювелірныя майстэрні.

Сама Еўфрасіння стварала і, магчыма, запісвала малітвы і дыдактычныя пропаведзі. Сярод суайчыннікаў прападобная была вядомая як справядлівы суддзя, дарадчыца і міратворца.

У сталым узросце Еўфрасіння адправілася ў паломніцтва ў Ерусалім. Там яна, знясіленая доўгім падарожжам, захварэла і памерла. Пахаваная вялікая беларуская асветніца была ў манастыры Святога Феадосія, недалёка ад Ерусаліма. У 1910 годзе мошчы Прападобнай былі перавезены ў Полацк.

Помнік у гонар Еўфрасінні Полацкай выканаў мінскі скульптар, член Саюза мастакоў Уладзімір Голубеў. Бронзавая постаць Еўфрасінні была адлітая ў Мінску. Помнік вышынёй у 3 метры 20 сантыметраў устаноўлены ў цэнтры горада. Прападобная Еўфрасіння апранутая ў строгае манаскае адзенне. У руцэ яна трымае найвялікшую праваслаўную святыню Крыж-каўчэг, зроблены па яе просьбе Лазарам Богшам. Бронзавая статуя Еўфрасінні стаіць на скрыжаванні вуліц, адна з якіх вядзе да Спаса-Еўфрасіньеўскага манастыра, дзе захоўваюцца яе мошчы. Па задуме скульптара, Прападобная Еўфрасіння знаходзіцца як бы на шляху ад месца свайго нараджэння да месца свайго прызначэння.

## Помнік Сімяону Полацкаму



Помнік Сімяону Полацкаму быў адкрыты ў Полацку 7 верасня 2003 года, у дзень святкавання беларускага пісьменства. Аўтары помніка: скульптар Аляксандр Фінскі, архітэктары Георгій Фёдараў і Наталля Цавік.

Вялікі асветнік, педагог, палітык, вучоны, пісьменнік, паэт і багаслоў Сімяон Полацкі пакінуў глыбокі след у культуры Беларусі.

Сімяон Полацкі нарадзіўся ў Полацку ў 1629 годзе. Вучыўся ў Кіеўска-Магілянскай калегіі – каталіцкай вышэйшай навучальнай установе. У 1656 годзе С. Полацкі прыняў праваслаўе і пастрыгся ў манахі. Дзякуючы сваёй адукацыі, ён хутка прасоўваўся па царкоўнай іерархіі. Яго пропаведзі праславіліся далёка за межамі Вялікага Княства Літоўскага.

Сімяон Полацкі пісаў вельмі незвычайныя вершы, афармляючы іх у выглядзе зоркі, крыжа або сэрца. У XVII стагоддзі такое ўменне высока шанавалася, ды і ў нашы дні вытанчаная славеснасць адукаванага манаха дзівіць уяўленне сучаснікаў.

У Полацку імем асветніка названы музей-бібліятэка Сімяона Полацкага. У ім захоўваюцца унікальныя кнігі, выдадзеныя Сімяонам Полацкім і яго рукапісы.

## Помнік літары «ў»



Гэты помнік у Полацку з'яўляецца абсалютна ўнікальным і вельмі незвычайным. Ён адзіны ў сваім родзе. І таму ёсць лагічнае тлумачэнне. Бо акрамя беларускай мовы больш ні ў адной мове свету не сустракаецца літара «ў».

Літара «ў» – гэта эксклюзіўны знак беларускай мовы. Помнік у Полацку хоць і прысвечаны асобнай літары беларускага алфавіту, але па сутнасці з'яўляецца помнікам культурнай своеасаблівасці ўсяго беларускага народа.

Помнік устаноўлены ў Полацку 3 верасня 2003 года, падчас дзясятага святкавання Дня беларускага пісьменства. Аўтар помніка – Ігар Куржалоў, галоўны мастак Полацка. Бронзавы помнік вышынёй 3 метры 50 саныметраў, адліты па праекце вядомага скульптара Аляксандра Шапо і устаноўлены ў новым жылым мікраараёне горада.

## ЁН ПЕРШЫ КНІГУ ДАЎ СЛАВЯНАМ…

*Ён першы кнігу даў славянам,*
*На простай мове ўзорны ліст.*
*Ён знаў: з-за хмараў валавяных*
*Праб'ецца сонца на зямлі.*

***А. Іверс***

Галоўны скарб нашай краіны – людзі! Яны ўслаўляюць сваю зямлю, нясуць у свет добрае імя беларусаў.

Полацк даў Беларусі і ўсяму свету шмат выдатных людзей. Наш народ заўсёды будзе памятаць імёны асветніцы Еўфрасінні Полацкай, першадрукара Францыска Скарыны і славутага паэта Сімяона Полацкага...

Пра людзей мы мяркуем па справах, якія яны здзейснілі, па спадчыне, якую яны пакінулі сваім нашчадкам. І наш славуты зямляк Францыск Скарына – у гэтым сэнсе найярчэйшы прыклад. Ён з'яўляецца сімвалам усёй беларускай культуры эпохі Адраджэння. У асобе Францыска Скарыны талент даследчага вучонага, мудрага асветніка і вялікага патрыёта роднай зямлі спалучаўся з талентам выдатнага паэта і мастака. Скарына – першы, хто адкрыў ва Усходняй Еўропе кнігадрукаванне і зрабіў кнігу даступнай вялікаму колу людзей. Скарына – наш гонар і слава, бо яго нарадзіла і ўскарміла менавіта наша беларуская зямля.

**Францыск Скарына** (каля 1490 г. – каля 1551 г.) – заснавальнік усходнеславянскага кнігадрукавання, выдавец, асветнік, гуманіст, пісьменнік, перакладчык, доктар медыцыны – нарадзіўся ў Полацку у купецкай сям'і. Бацька Лука і старэйшы брат Іван займаліся гандлем у многіх гарадах Вялікага Княства Літоўскага і іншых краінах. Гандлявалі скурай (матэрыялам, які ішоў на адзенне, абутак, збрую), ад назвы якой (старажытны варыянт «скора»), верагодна і пайшло іх прозвішча. У купецкім доме жыло адчуванне шырыні свету, разуменне карысці повязяў чалавека з чалавекам, асобы з грамадствам, з народам, з прыродай.



Дзейнасць купцоў патрабавала ў часы Францыска Скарыны ведаў, прадпрымальнасці і адвагі. Каб весці гандаль у замежных краінах неабходна было ведаць мовы, звычаі і законы чужых дзяржаў. Расказы пра небяспеку далёкіх дарог, экзотыку земляў, звычаяў у розных гарадах склалі духоўную атмасферу дзяцінства Францыска Скарыны. Гэта абудзіла ў яго ахвоту да пазнання свету, навук, таямніц прыроды.

Пачатковую адукацыю хлопчык атрымаў у Полацку ці сталічнай Вільні. У 1504 годзе быў прыняты на факультэт свабодных навук Кракаўскага універсітэта – адной са старэйшых і лепшых навучальных устаноў Еўропы – і тут у 1506 годзе атрымаў ступень бакалаўра свабодных мастацтваў, якая давала права насіць пярсцёнак-пячатку і выкладаць рыторыку ў школах. У час вучобы ў Кракаве Скарына ўсвядоміў навуковыя і асветніцкія магчымасці друкаванай кнігі, пазнаёміўся з багатай кніжнай прадукцыяй замежных друкарняў, з тэхнікамі друку. Менавіта ў Кракаве ў Францыска Скарыны выспела высакародная задума – даць і свайму народу друкаваную кнігу на яго ж роднай мове.

Вынаходніцтва каля 1440 года кнігадрукавання немцам Іаганам Гутэнбергам з'яўляецца адным з найвялікшых дасягненняў чалавецтва. Ужо ў канцы 15 стагоддзя ў Еўропе дзейнічала звыш 200 друкарняў у 69 гарадах. Польшча стала другой пасля Чэхіі краінай, якая ўкараніла вынаходніцтва Гутэнберга.

На жаль, дакладна немагчыма вызначыць усе этапы біяграфіі нашага славутага земляка. Вядома, што ў 1507 – 1511 гг. Францыск Скарына працягваў адукацыю ў адным з еўрапейскіх універсітэтаў (магчыма, у Кракаве, Празе ці Германіі), паглыбляў свае веды па філасофіі, праве,

прыродазнаўстве, медыцыне. Восенню 1512 года Францыск прыбыў у Італію ў знакаміты Падуанскі ўніверсітэт. Ён ужо меў ступень доктара свабодных навук і быў сакратаром дацкага караля. 9 лістапада ў прысутнасці 24-х буйнейшых вучоных Падуанскага універсітэта Скарына быў экзаменаваны ў галіне медыцыны і адзінадушна прызнаны ў званні доктара медыцыны.

У 1513 – 1516 гг. Францыск Скарына пачаў займацца кнігадрукаваннем. Заручыўшыся фінансавай падтрымкай землякоў з Вільні і Полацка: багатых віленскіх гараджан Багдана Онкава, Якуба Бабіча, Юрыя Адверніка, свайго брата Івана, ён паехаў у Прагу і там заснаваў друкарню, у якой паклаў пачатак беларускаму і ўсходнеславянскаму кнігадрукаванню. У 1517 годзе ён выдаў сваю першую кнігу – «Псалтыр», а потым на працягу 1517 – 1519 гг. – яшчэ 22 кнігі Біблії. Скарына выдаў іх з уласнымі прадмовамі і пасляслоўямі пад агульнай назвай «Библия руска». Выбар на карысць Біблії быў зроблены таму, што ў тыя часы, калі грамадства на яго радзіме яшчэ ў цэлым не ўзнялося да разумення значэння свецкай кнігі, Біблія была самай прыдатнай кнігай для яго асветніцкай мэты. Еўрапейскія гуманісты, якім з'яўляўся і наш зямляк, лічылі Біблію свайго роду ўніверсальным падручнікам, энцыклапедыяй, дзе чытач мог знайсці адказы на многія складаныя пытанні.

Мова Скарынавых выданняў набліжана да беларускай, хоць у аснове заставалася царкоўнаславянскай. Кнігі выдадзены на высокім для таго часу паліграфічным узроўні, аздоблены гравюрамі, сярод якіх двойчы змешчаны ўласны партрэт першадрукара; сігнетам – друкарскім знакам Скарыны з выявай сонца, прыкрытага месяцам; арнаментаваны застаўкамі і канцоўкамі.

Францыск Скарына ўвёў у свае выданні ілюстрацыі, як сродак раскрыцця ў мастацкіх вобразах зместу кнігі. Усіх ілюстрацый – 51. Гэта – гравюры, партрэты, кампазіцыі і ілюстрацыі прыкладнога характару.

Упершыню ў гісторыі ўсходнеславянскага кнігадрукавання асветнік увёў тытульны ліст, тлумачальныя падзагалоўкі, пааркушавую нумарацыю, абзацы – прыдаў кнізе сучасны выгляд.

Ва ўсіх выданнях Францыска Скарыны змешчаны прадмовы і пасляслоўі. Прадмовы Скарыны – арыгінальныя творы беларускай публіцыстыкі. Гэта звернутыя да простага чытача шчырыя, пранікнёныя словы мудрага настаўніка, у якіх ён старанна і зацікаўлена тлумачыць змест, вобразы, ідэю біблейскага твора. Характэрная асаблівасць скарынаўскіх прадмоў – прастата, даходлівасць, лаканізм, насычанасць багатай інфармацыяй, звесткамі па гісторыі, геаграфіі, культуры, філасофіі. Прадмовы напісаны багатай мовай: у іх сустракаецца мноства народных выслоўяў, біблейскіх афарызмаў, выказванняў першадрукара, якія сталі крылатымі. Асобныя прадмовы цікавы сваімі вершаванымі ўстаўкамі, якія

можна лічыць першымі вопытамі кніжнага вершаскладання на ўсходнеславянскіх землях.

Усё гэта зрабіла кнігі Францыска Скарыны ўнікальнымі помнікамі еўрапейскай кніжнай культуры і айчыннага мастацтва. Высокі паліграфічны ўзровень скарынаўскіх кніг доўгі час не маглі пераўзысці галандскія і германскія друкары.

У канцы 1519 года Францыск Скарыны перанёс кнігадрукаванне на ўсход Еўропы, на радзіму. У Вільні ў доме свайго апекуна, мецэната Якуба Бабіча ён уладкаваў першую на тэрыторыі Вялікага Княства Літоўскага друкарню і на працягу 1522 – 1525 гг. выпусціў у свет «Малую падарожную кніжку» (каля 1522 г.) і «Апостал» (у 1525 г.). Першая, невялікая па фармату, кніжка адрасавалася людзям, якія па характару сваіх заняткаў вымушаны былі часта вандраваць (купцы, воіны і інш.) і маглі ў дарозе атрымліваць з яе канфесійную, астранамічную інфармацыю, а пры неабходнасці – прыгадваць словы малітваў ці псалмаў. «Апостал» – адна з найбольш папулярных царкоўна-рэлігійных кніг, – першая дакладна датаваная кніга, надрукаваная на тэрыторыі ВКЛ і апошняе Скарынаўскае выданне.

Пра далейшае жыццё і дзейнасць Францыска Скарыны побач з шэрагам дакладных фактаў існуюць гіпотэзы. Да іх адносяцца меркаванні аб знаходжанні Скарыны ў 1525 годзе, у разгар Сялянскай вайны ў Германіі, у Вітэнбергу і аб яго сустрэчы з Марцінам Лютэрам, а таксама версія аб паездцы пасля 1525 года разам са сваім мецэнатам Багданам Онкавым з мэтай распаўсюджвання выдадзеных кніг і арганізацыі кнігадрукавання ў Маскву, дзе прывезеныя кнігі былі канфіскаваны і спалены.

Каля 1520 года у Вільні Францыск Скарына ажаніўся. Некалькі палепшылася яго матэрыяльнае становішча.

Невыносна цяжкім аказаўся для Скарыны 1529 год: памёр яго брат Іван, а затым жонка Маргарыта, пакінуўшы на руках Францыска малога сына Сымона. Яе родзічы пачалі адсуджваць у Скарыны маёмасць. Патрабавалі ад яго грошы і крэдыторы брата.

Жыццёвых нягод, якія абрынуліся на першадрукара, хапіла, каб рашыцца на змену месцажыхарства. Каля 1535 года ён ужо назаўсёды пакідае радзіму і пасяляецца ў Празе. У чэшскай сталіцы ён працаваў вучоным-батанікам і садоўнікам у каралеўскім батанічным садзе Фердынанда і Габсбурга. Ёсць меркаванне, што сам Скарына і заснаваў той сад, працягнуўшы гэтым вялікую традыцыю сярэднявечнай культуры – узгадоўваць і апяваць сады. У Чэхіі Францыск Скарына правёў апошнія гады свайго жыцця і памёр у канцы 1551года ўдалечыні ад радзімы. Месца яго пахавання невядома.

Жыццёвы шлях Францыска Скарыны ў многім быў паказальны для людзей эпохі Адраджэння. Любоў да ведаў, шырыня адукацыі ў яго спалучаліся з высокай грамадзянскасцю, дзелавітасцю і смеласцю. Скарына быў арагінальным філосафам і таленавітым пісьменнікам. Багацце асобы Францыска Скарыны ставіць яго ўпоравень з выдатнейшымі людзьмі эпохі Рэнесансу.

* * *

Геніяльнае пачынанне, традыцыі Францыска Скарыны былі падхоплены і працягнуты яго сучаснікамі і паслядоўнікамі – друкарамі, пісьменнікамі, вучонымі – Іванам Фёдаравым, Пятром Мсціслаўцам, Сымонам Будным, Васілём Цяпінскім, братамі Мамонічамі і іншымі. Кнігі Скарыны распаўсюджваліся і карысталіся папулярнасцю і аўтарытэтам на тэрыторыі Беларусі, Украіны, Літвы, Расіі і іншых краін. Яны беражліва захоўваліся і перадаваліся з пакалення ў пакаленне, служылі для пераймання паслядоўнікамі і здзяйснялі вялікую культурную місію ва Усходняй Еўропе. На сённяшні дзень захавалася каля 400 экзэмпляраў кніг Францыска Скарыны. Як найкаштоўнейшыя рэліквіі яны зберагаюцца ў музеях і бібліятэках розных краін свету.

Імя знакамітага палачаніна ўшанавана ў мемарыяльных дошках і помніках ва ўсім свеце. Велічны бронзавы помнік першадрукару з'явіўся ў Мінску каля Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі. А галоўная вуліца нашай сталіцы называецца праспектам імя Францыска Скарыны. У горадзе Полацку працуе музей кнігадрукавання.

Імем Францыска Скарыны названа малая планета № 3283 (1979 QA10) Сонечнай сістэмы

Уведзены дзяржаўныя ўзнагароды Беларусі – медаль Францыска Скарыны (1989 г.) і ордэн Францыска Скарыны (1995 г.)

Медалем Францыска Скарыны ўзнагароджваюць работнікаў навукі, адукацыі і культуры за выдатныя дасягненні ў прафесійнай дзейнасці, значны асабісты ўклад у развіццё культурнай спадчыны беларускага народа.

Ордэн Францыска Скарыны ўручаюць за значныя поспехі ў галіне нацыянальна-дзяржаўнага адраджэння, выдатныя даследаванні гісторыі Беларусі, дасягненні ў галіне нацыянальнай мовы, літаратуры, мастацтва, кнігавыдавецтва, культурна-асветніцкую дзейнасць, прапаганду культурнай спадчыны беларускага народа; за заслугі ў гуманітарнай, дабрачыннай дзейнасці і іншыя высакародныя ўчынкі.

## КНІЖНУЮ МУДРАСЦЬ ЁН НЁС ДЛЯ ЛЮДЗЕЙ:
## філасофскія і эстэтычныя погляды Францыска Скарыны

*«Як звяры, што блукаюць у пушчы, ад нараджэння ведаюць сховы свае, як птушкі, што лётаюць у паветры, помняць гнёзды свае, як рыбы, што плаваюць у моры і ў рэках, чуюць віры свае і як пчолы бароняць вуллі свае – гэтак і людзі да месца, дзе нарадзіліся і ўзгадаваны ў Бозе, вялікую ласку маюць».*

***Ф. Скарына***

Філасофска-этычныя погляды Францыска Скарыны – своеасаблівы сінтэз сярэдневякова-хрысціянскіх, антычных і рэнесансава-гуманістычных ідэй. У цэнтры ўвагі – духоўны свет чалавека, яго каштоўнасці, ідэалы, прызначэнне: *«Да совѢршен будет человѢк Божий и на всяко дѢело добро уготован»*.

Ідэалам для Скарыны быў чалавек, які спалучаў біблейскую і філасофскую мудрасць. Ва ўяўленні Францыска Скарыны мудрасць – гэта веды, веды існага: *«Мудрость, якобы моць в драгом камени, и яко злато в земли, и ядро ув ореху. Кто ю [яе] знайдеть, сей знайде милость и достанеть благословения от Господа, и приидеть к нему все доброе посполу с нею, хвала и честь безчисленая моцию ея, – она убо ест мати всех добрых речей и учитель всякому доброму умению»*. Адукацыя, культура, лічыў ён указваюць чалавеку шлях да індывідуальнага і грамадскага дабра, з'яўляюцца асновай дабрачыннасцей і зямнога шчасця.

У прадмове да кнігі «Эсфір» Скарына сфармуляваў сваё разуменне грамадскага абавязку: *«Не толико сами собе народихомся на свет, но более ко службѢ Божией и посполитого доброго»*. Сваю ўласную дзейнасць Францыск Скарына таксама разглядаў перш за ўсё як служэнне агульнаму дабру, як выкананне свайго абавязку перад народам, «братьями русью» і радзімай. Гэту думку ён падкрэсліваў амаль у кожнай прадмове і пасляслоўі.

Францыск Скарына – заснавальнік нацыянальна-патрыятычнай традыцыі ў гісторыі беларускай культуры і грамадскай думкі. Свой патрыятызм выказаў у словах: *«Понеже от прирожения звери, ходящие в пустыни, знають ямы своя; птици, летающие по возѢдуху, ведають гнезда своя; рибы, плывающие по морю и в реках, чують виры своя; пчелы и тым подобная боронять ульев своих, – тако ж и люди, игде зродилися и ускормлены*

*суть по Бозе, к тому месту великую ласку имають»* (з прадмовы да кнігі ўдавы Юдзіф).

Палітычны ідэал Францыска Скарыны – асветная, гуманная і моцная манархічная ўлада. На яго думку, правіцель павінен быць набожным, чулым, справядлівым да сваіх падданых. Ён абавязаны кіраваць краінай у строгай адпаведнасці з законамі, сачыць за выкананнем правасуддзя. Адначасова правіцель павінен быць грозным і моцным, умець у неабходным выпадку абараніць свой народ. Аналіз асноўных дзяржаўна-прававых ідэй Скарыны дазваляе зрабіць вывад пра яго значны ўклад у прававую навуку, асабліва ў тэорыю дзяржавы і права. Супастаўленне прававых ідэй Скарыны са зместам Статута 1529 года дазваляе зрабіць вывад аб практычным увасабленні некаторых яго ідэй у заканадаўстве. Гэта ў сваю чаргу дае падставы меркаваць, што ён мог прымаць непасрэдны ўдзел у распрацоўцы Статута 1529 года.

У аснове этычнай канцэпцыі Францыска Скарыны – думка пра неабходнасць і магчымасць пастаяннага ўдасканалення чалавека, ад якога залежыць дасканаласць грамадскага жыцця. Ен піша пра цара Саламона, які *«не просил еси собѢ дней многых, ни богатества»*, а *«мудрости и разума»*. З этычнага вучэння Скарыны ўскосна вынікала, што людзей павінна аб’ядноўваць перш за ўсё ідэя агульнага дабра, а грамадскія інтарэсы павінны быць вышэй за рэлігійныя рознагалоссі.

Францыск Скарына надаваў вялікае значэнне эстэтычнаму выхаванню і наогул духоўнаму ўдасканаленню людзей сродкамі мастацтва. Пра гэта сведчыць яго прадмова да «Псалтыра» – кнігі, якая з усіх частак Бібліі найбольш блізкая да мастацтва – паэзіі і музыкі. Песні і вершы «Псалтыра» – *«всякии немощи, духовныи и телесныи, уздравляють, душу и смыслы освѢщають, гнев и ярость усмиряють, мир и покой чинять, смуток и печаль отгоняют, чювствие в молитвах дають, людей в приязнь зводять, ласку и милость укрепляють»*. Яны– *«покой денным суетам и роботам, защититель младым и радость старым, потеха и песня, женам набожная молитва и покраса, детем малым початок всякое доброе науки, дорослым помножение в науце, мужем моцное утверъжение»*.

Скарыне належаць першыя спробы сілабічнага вершаскладання на тагачаснай беларускай мове. Рэнесансавае самасцвярджэнне асобы пісьменніка выявілася ў пастаянных дэкларацыях свайго аўтарства: «*Я, Францыск, Скарынін сын з слаўнага града Полацка…*». Гэта гучыць гордым лейтматывам ва ўсіх прадмовах і пасляслоўях, з якіх Скарына паўстае перад намі як таленавіты пісьменнік, перакладчык, філосаф, эстэтык, правазнаўца.

Подзвіг Францыска Скарыны – пераклад і выданне на тагачаснай беларускай мове Біблії, якую ён разглядаў як сродак масавай асветы народа. Побач з англійскім перакладам Джона Уікліфа (14 ст.), чэшскім перакладам Яна Гуса (15 ст.) і нямецкім перакладам Марціна Лютэра (16 ст.) гэта быў адзін з першых перакладаў Біблії на нацыянальную мову (у цяперашні час Біблія перакладзена –цалкам альбо часткова – больш чым на 2000 моў).

Выключна ўсе пастулаты Скарынавага светапогляду, рэалізаваныя ў яго творчасці і выдавецкай дзейнасці, надзвычай актуальныя і надзённыя сёння. А перспектыва будучыні забяспечваецца тым *«законам прироженым»*, пра які так натхнёна, так шчыра і пераканальна нагадваў нам праз вякі наш слынны суайчыннік.

Францыск Скарына нідзе спецыяльна не выкладаў сваіх філасофскіх і эстэтычных поглядаў у сістэматызаванай форме. Яны могуць быць выяўлены толькі на падставе аналізу ўсёй яго літаратурнай спадчыны.

## ПРЫСВЯЧЭННЕ РОДНАМУ СЛОВУ:
## мова выданняў Францыска Скарыны

*Марыў калісьці славуты Скарына,*
*“Ціснучы” кнігі на мове бацькоў:*
*Простаму люду ў роднай краіне*
*Зробіць даступнай ѐн мудрасць вякоў...*

***Н. Гілевіч***

Мова выданняў Францыска Скарыны – гэта мова, на якой гаварыла і пісала адукаванае насельніцтва тагачаснай Беларусі і ўсяго Вялікага княства Літоўскага. Яна адлюстроўвала прагрэсіўную тэндэнцыю, калі з пісьмовых тэкстаў, пераважна свецкіх, такіх як летапісы і дзелавыя дакументы, а паступова і з канфесіянальнай літаратуры, выцясняліся старажытнарускія і царкоўнаславянскія рысы, якія замяняліся адпаведнымі сродкамі жывой беларускай мовы.

Даследчыкі прытрымліваюцца думкі, што мова твораў Скарыны – узор беларускай рэдакцыі царкоўнаславянскай мовы (таксама беларуская мова, прамежкавая паміж царкоўнаславянскай і беларускай). Гэты тып мовы ён стварыў у прымяненні да патрэб свайго часу – зрабіць зразумелымі для чытачоў царкоўнаславянскія тэксты шляхам замены архаічных царкоўнаславянскіх форм слоў мясцовымі беларускімі.

Стылявая вабнасць мовы адпавядае той задачы, якую ставіў перад сабой Францыск Скарына. Галоўнае ў ёй – яснасць і афарыстычная змястоўнасць. Звычайнае гаваркое слова ў біблейскім стылявым кантэксце

дзякуючы Скарыне набывала выключную меладычную, эстэтычную выразнасць.

З пункту погляду адносін да жывой беларускай мовы выданні Скарыны падзяляюцца на дзве групы. «Псалтыр», «Малую падарожную кніжку» і «Апостал» першадрукар выпусціў на царкоўнаславянскай мове беларускай рэдакцыі. Гэта значыць, што ў іх знайшлі адлюстраванне многія рысы беларускай мовы ў галіне фанетыкі, граматыкі і лексікі.

Яшчэ далей пайшоў Скарына пры перакладзе іншых біблейскіх кніг. У перакладах пражскіх выданняў 1517–1519 гадоў ён захаваў царкоўнаславянскую моўную аснову, але ўзбагаціў іх беларускімі моўнымі сродкамі ў такой меры, што мова яго перакладаў заняла самае крайняе становішча ў беларускай рэдакцыі царкоўнаславянскай мовы і аказалася прамежкавым звяном у працэсе пераходу ад царкоўнаславянскай мовы да беларускай у сферы рэлігійнага ўжытку.

У сваёй перакладчыцкай і асветніцкай дзейнасці Францыск Скарына стаяў ля вытокаў станаўлення нацыянальнай літаратурнай мовы. У лінгвістыцы ён паспеў зрабіць за цэлае пакаленне моўных рэфарматараў і пісьменнікаў і ў далёкім ад нас 16 стагоддзі сваёй таленавітай моватворчасцю здолеў узняць родную мову на вышыню найдасканалейшай літаратурнай мовы Еўропы.

## МАСТАЦТВА СКАРЫНАВАЙ КНІГІ:
### аздабленне выданняў



*Гравюры Скарыны!*
*Ён выразаў іх*
*На спаконвечным*
*Дрэве гісторыі*
*Свайго народа,*
*Хоць мог бы падабраць*
*І больш падатлівы,*
*І больш удзячны*
*Матэрыял.*
*І выразаў ён іх*
*Не штыхелем-разцом,*
*А промнем сонца,*
*Промнем сваёй веры*
*І любові да народа.*
*Таму штрых кожны*
*Быў такі глыбокі,*

*Што ні агонь,*
*Ні забыцьцё,*
*Ні ворагі,*
*Ні час*
*Гравюраў гэтых*
*Зьнішчыць*
*Не змаглі.*

**М. Танк**

Выданні Францыска Скарыны вызначаюцца высокімі выдавецкімі і друкарскімі якасцямі. Іх упрыгожваюць сюжэтна-тэматычныя і прыкладныя па сваім прызначэнні ілюстрацыі, якія вылучаюцца арыгінальнасцю кампазіцый і сюжэтаў, майстэрствам гравіравання і рэалізмам. Скарына першы выкарыстаў ілюстрацыю як сродак, які дапамагае чытачу глыбей і паўней зразумець літаратурную крыніцу, ясней уявіць сабе герояў кнігі, успрыняць яе змест.

Вялікімі сюжэтнымі гравюрамі адзначаны тытульныя лісты большасці кніг Бібліі. Напрыклад, тытульны ліст кнігі «Юдзіф» упрыгожаны гравюрай з выявамі біблейскіх асоб. Вылучаюцца гравюры Скарыны на тэмы Старога запавету – «Цар Давід», «Бічаванне Іова», «Суд Саламона», «Саламон і царыца Саўская», «Памазанне Давіда», «Самсон і леў» і іншыя, змешчаныя ў Бібліі; новазапаветныя – «Хрышчэнне ў Іардане», «Хрыстос у Храме», «Багародзіца з анёламі» (у «Малой падарожнай кніжцы») і ілюстрацыі прыкладнога характару з выявамі храма, херувімаў, дома Саламона (у Бібліі).

Не звязанымі з тэкстамі кніг з’яўляюцца гравюрны партрэт Францыска Скарыны і гравюра «Благаславенне». Партрэт першадрукара двойчы змешчаны ў кнігах скарынаўскай Бібліі («Ісус Сірахаў», 1517 г.; 4-й кнізе «Царствы»), а таксама ў экзэмпляры кнігі «Быццё» (1519 г.), які захоўваецца ў Расійскай нацыянальнай бібліятэцы і зроблены хутчэй за ўсё з натуры ў 1517 годзе. Гэта – адзін з самых ранніх партрэтаў друкароў. На гравюры Скарына паказаны ў сваім рабочым пакоі. Ён сядзіць у крэсле за невысокім столікам з пяром у правай руцэ. Перад ім – разгорнутая кніга, злева на паліцы – другая кніга, на якую скіраваны погляд першадрукара. Мяркуецца, што Скарыну на партрэце



павінна быць 27 гадоў, але выглядае ён значна старэйшым. Апрануты ў доктарскую мантыю, на галаве – берэт. Столік пакрыты абрусам з беларускім

арнаментам і выявай сігнета Скарыны. Вакол шмат розных рэчаў: кнігі, кошыкі, пясочны гадзіннік і г. д. Яны падкрэсліваюць інтарэсы Скарыны ў галінах кнігадрукавання, медыцыны, астраноміі, мастацтва. Асобныя дэталі носяць сімвалічны характар. Так, працавітая пчала, якая бачна ў правым ніжнім вугле партрэта, сведчыць пра руплівасць і працаздольнасць. На гравюры няма ніводнага царкоўнага сімвала або атрыбута. Усе дэталі гавораць пра свецкі характар яго дзейнасці. Твор вылучаецца значнай мастацкай дасканаласцю. Рускі крытык У.В. Стасаў пісаў, што гэты партрэт не саступае самым выдатным нямецкім гравюрам свайго часу па характары малюнка, сіле і каларытнасці. Партрэт Францыска Скарыны – лепшая гравюра ў яго Бібліі. Аўтар пакінуў на ім сваю манаграму.

Астатнія гравюры скарынаўскіх выданняў ананімныя. Ёсць меркаванне, што ствараліся яны рознымі людзьмі. Аднак частка з іх пазначана гербам-сігнетам Скарыны, што сведчыць пра яго непасрэднае дачыненне да гэтых твораў.

Першадрукар быў ініцыятарам ілюстравання сваіх выданняў. Існуе думка, што Скарына сам рабіў малюнкі да сваіх гравюр і нават быў рэзчыкам. Да таго ж яму належаць усе подпісы да ілюстрацый сваіх твораў.

Фігурныя выявы кніг Францыска Скарыны значна дапаўняюць арнаментальныя гравюры – застаўкі, канцоўкі, віньеткі і ініцыялы. Яны садзейнічаюць ідэйна-змястоўнай і дэкаратыўна-прасторавай арганізацыі старонак, падзяляюць тэкст на раздзелы і главы, арганізоўваюць найбольш поўнае ўспрыманне надрукаванага. Адначасова сваім дэкорам надаюць старонкам прыгажосць, святочнасць, фарміруюць ансамбль мастацкай аздобы кніг у цэлым. Асабліва выразныя арнаментальныя «болшие» застаўкі, у якіх выявы людзей аб’яднаны з раслінная арнаментыкай. Гэтыя застаўкі звычайна размешчаны пасля прадмовы ў пачатку тэксту кнігі. Яны адзначаюць пачатак чытання і адначасова выконваюць раздзяляльную функцыю.

Асаблівае месца ў выяўленчым апараце скарынаўскіх выданняў адведзена сістэме ініцыялаў (буквіц). Расшыфроўка іх даследчыкамі раскрывае карпатліва распрацаваную сістэму буквіц-гравюр, у якіх закадзіраваны пачаткі глаў буквара з малюнкамі. Упершыню ў Еўропе беларускі асветнік ілюструе загалоўныя літары выявамі жывёл, раслін, шырока вядомымі ў народзе з’явамі або дзеяннямі.

Старадрукі Францыска Скарыны з’яўляюцца сапраўднай «лабараторыяй пошукаў» ілюстрацыйных прынцыпаў аздаблення кнігі. Па багацці, разнастайнасці і майстэрстве арнаментальных элементаў у той час яны не мелі сабе роўных.

## НАПІСАНАЕ ЗАСТАЕЦЦА:
**афарызмы і цытаты Францыска Скарыны**

- «Любіце кнігу, бо яна – крыніца мудрасці, ведаў і навукі, лекі для душы»

- «У прытчах затоена мудрасць, як моц у каштоўным камені, як золата ў зямлі і ядро ў арэху»

- «Як звяры, што блукаюць у пушчы, ад нараджэння ведаюць сховы свае, як птушкі, што лётаюць у паветры, помняць гнёзды свае, як рыбы, што плаваюць у моры і ў рэках, чуюць віры свае і як пчолы бароняць вуллі свае – гэтак і людзі да месца, дзе нарадзіліся і ўзгадаваны ў Бозе, вялікую ласку маюць»

- «Кніга (Біблія) – люстэрка людскога жыцця і душэўныя лекі, уцеха – самотным, зняверанымі – помач, і асабліва тым, каго немач точыць і верад рушыць»

- «Гэтая кніга (Біблія) дзецям і простым людзям – навука, а мудрацам і вучоным – дык дзіваванне. Яна, як рака цудадзейная, адначасова плыткая – можна па ёй і дзіцяці брысці, і незвычайна глыбокая – слон плысці мусіць»

- «Кожны чалавек разумее сваё шчасце па-свойму»

- «Ніякай працы і скарбаў ніякіх не шкадуйце для паспалітай карысці для айчыны сваёй»

- «У добрых справах і ў любасці да айчыны ўпадабняйцеся»

- «Філасофія падымае пытанне і на пытанне шукае адказу»

- «Біблія – дзівосная рака! Яна бывае мелкай, што нават авечка можа перайсці яе, але адначасна і глыбокай, калі і слон змушаны плысці цераз яе! У гэтай кнізе – пачатак і канец усёй існай мудрасці! Толькі праз яе можна спасцігнуць Бога-Уладара! У гэтай кнізе – усе законы і правы, якімі карыстаюцца людзі у зямным жыцці! У гэтай кнізе ўсе лекі душэўныя і цялесныя разам знойдзеце!»

- «Усе справы і ўсе навукі, якімі багаты свет, немінуча мінаюць разам з уявай свету»
- «Кожны думае пра сваё і разважае па свойму»
- «У самыя розныя рэчы, заняткі і справы на гэтым свеце людзі ўкладаюць і думкі свае, і душу сваю і ў іх маюць сялібу сваёй любові»
- «Найвышэйшая мудрасць у разважанні пра смерць, у спазнанні сябе самога і ў памятанні наступнасці»
- «Жыццё, якім жывуць людзі на гэтым свеце, ад іх спаўна не залежыць, канец жа чакае і добрых людзей, і благіх, і праведнікаў, і ліхадзеяў»
- «Чалавекалюбству чужая ліслівасць і незнаёмае запабязанне»
- «Найдаражэйшыя скарбы – чалавечыя словы, натхнёныя Богам і выслаўленыя да Бога».

## **КНІЖНАЯ СПАДЧЫНА:**
**выдадзена Францыскам Скарынам**



- **ПРАГА 1517, 6 жніўня – першае выдане Ф. Скарыны – «Псалтыр»**



- **10 верасня – «Кніга Іова»**



- **6 кастрычніка – «Прытчы Саламонавы»**



- **5 снежня – «Кніга Ісуса Сірахава»**



- 2 студзеня – Кніга **«Еклесіят», або «Саборнік»**



- 9 студзеня – **«Песня Песням»**



- 19 студзеня – Кніга **«Прамудрасць божая»**

- 10 жніуня 1518 – **«Кніга Царстваў»**





- 20 снежня – **«Кніга Ісуса Навіна»**



- **9 лютага 1519 – Кніга «Юдзіф»**



- **15 снежня – «Кніга Суддзяў»**



- **15 снежня – Кніга «Быцце»**



- **Каля 1519 – Кніга «Выхад»**



- **Каля 1519 – Кніга «Левіт»**



- **Каля 1519 – Кніга «Лічбы»**



- **Каля 1519 – Кніга «Другі закон»**



- **1519 – Кніга «Руф»**



- **1519 –Кніга «Эсфір»**



- **1519 –Кніга «Плач Ераміі»**



- **1519 – «Кніга прарока Данііла»**

(апошняе пражскае выданне)



- **Вільня. Каля 1522 года – выйшла першае віленскае выданне – «Малая падарожная кніжка», якая паклала пачатак кнігадрукаванню ў нашай краіне**



- **Вільня. Каля 1525 – выйшла апошняе віленскае выданне Францыска Скарыны – «Апостал», якое з'яўляецца першай дакладна датаванай кнігай, надрукаванай на тэрыторыі Беларусі**

## ФОРМЫ ІНФАРМАЦЫЙНА-МАСАВЫХ МЕРАПРЫЕМСТВАЎ З НАГОДЫ СВЯТКАВАННЯ 500-ГОДДЗЯ БЕЛАРУСКАГА КНІГАДРУКАВАННЯ

Традыцыйна ў святочных мерапрыемствах, прысвечаных беларускаму пісьменству актыўны ўдзел бяруць бібліятэчныя ўстановы. У гэты дзень яны становяцца адкрытымі пляцоўкамі па папулярызацыі і прапагандзе кніжнай спадчыны Беларусі, гісторыі беларускай мовы і кнігадрукавання.

Пры арганізацыі святочных мерапрыемстваў у бібліятэках неабходна выкарыстоўваць розныя формы мерапрыемстваў, ад традыцыйных (гадзіна гісторыі, гадзіна цікавых паведамленняў, вусны часопіс, літаратурныя чытанні) да крэатыўных. Важна, каб яны былі прывабныя для чытачоў, выхоўвалі цікавасць і паважлівае стаўленне да гісторыі, мовы і традыцый беларускага народа, пачуццё патрыятызму, гонар за сваю Радзіму, знаёмілі з асаблівасцямі ўзнікнення беларускага кнігадрукавання, садзейнічалі павышэнню цікавасці да чытання кніг.

### Прапануем некаторыя цікавыя формы правядзення мерапрыемстваў у бібліятэках:

«Дыскусійныя арэлі». Дзве групы ўдзельнікаў мерапрыемства размяшчаюцца адзін супраць аднаго. Пасля таго як прапанавана пытанне для абмеркавання, яны па чарзе ад кожнай групы выказваюць асабістыя меркаванні – «арэлі» пачынаюць свой рух. Адзін з варыянтаў «дыскусійных арэляў», пры якім кожная з груп выбірае пэўную ролю, пазіцыю – «за» і «супраць» аргументу вядучага, «аптымісты» і «песімісты». Напрыклад: «Я лічу, што друкаваная кніга лепш за электронную, таму што ...» – пачынае адзін бок. «А я не лічу, што друкаваная кніга лепш за электронную, таму што ...» – адказвае іншы бок.

«Інфарм-дайджэст». Удзельнікі мерапрыемства рыхтуюць кароткія, яркія паведамленні пра гіторыю беларускага пісьменства. Тэма асвятляецца па прыкладзе аднайменнай тэлеперадачы «Як гэта было». Бібліятэкар дае асноўную гістарычную даведку, прадстаўляе гасцей і арганізуе дыялог. Выступленні павінны быць кароткімі (3–5 хвілін), але ёмкімі, якія дапамаглі б паглыбіць і разнастаіць веды слухачоў. Дадаткова можна выкарыстаць відэаматэрыялы, фотаздымкі і да т.п.

Бібліятэчны Non Stop прысвечаны Дню беларускага пісьменства. Увесь дзень бібліятэка ўяўляе сабой пляцоўку для адкрытых інтэрактыўных зносін

з цікавымі і творчымі людзьмі, стваральнікамі кнігі – пісьменнікамі, журналістамі, выдаўцамі і інш.

Найбольш дасціпным чытачам можна прапанаваць паўдзельнічаць у Парадзе забытых літараў – праверыць свае веды літараў стараруская алфавіта, яго гісторыю і майстар-класе па book-арце «Цуда-кнігу створым самі».

**У рамках святкавання 500-годдзя беларускага кнігадрукавання могуць быць арганізаваны віртуальныя экскурсіі ў музеі кніг і кнігадрукавання, аддзелы рэдкіх кніг буйнейшых бібліятэк г. Мінска:**

Полацкі музей беларускага кнігадрукавання (http://book.polotsk.museum.by)

Музей прысвечаны кнізе ва ўсіх яе аспектах, пачынаючы ад першых рукапісных скруткаў да сучаснай кнігі, знаёміць наведвальнікаў з гісторыяй стварэння пісьменнасці, пісьмовых прылад, кніжнай ілюстрацыі, паліграфіі. Ён з'яўляецца адзіным у Беларусі музеем такога тыпу. Падарожнічаючы па залах музея, адчуваеш не толькі гонар за нашых вялікіх асветнікаў, але і за нашых сучаснікаў, стараннем якіх ствараецца кніга сучасная.

Музей кнігі Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі (http://portal.nlb.by/portal/page/portal/index/content?lang=ru&classId=28FD302457B544C58AF689F851A596AD)

У музеі кнігі больш за трыста ўнікальных кніжных помнікаў з фондаў Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі: рукапісныя і старадрукаваныя кнігі, рэдкія кнігі 19 –20 стст. Сярод экспанатаў знаходзіцца жамчужына калекцыі – кнігі Бібліі (1517–1519 гг.) беларускага першадрукара Францыска Скарыны.

Аддзел рэдкіх кніг і рукапісаў Цэнтральнай навуковай бібліятэкі імя Я. Коласа Нацыянальнай акадэміі навук (http://csl.bas-net.by)

Тут захоўваецца адзіны ў рэспубліцы экзэмпляр знакамітай Брэсцкай або Радзівілаўскай Бібліі (1563 г.), ініцыятарам стварэння якой быў адзін з самых уплывовых магнатаў Вялікага княства Літоўскага – Мікалай Радзівіл Чорны. У свой час гэтая Біблія з'яўлялася самым фундаментальным і прыгожа афармленым выданнем Святога Пісання ў ВКЛ. У якасці самастойнага комплексу ў фондзе аддзела рэдкіх кніг і рукапісаў прысутнічае прыватны кніжны збор вядомага беларускага паэта, акадэміка НАН Беларусі Пятра Фёдаравіча Глебкі (1905 – 1969 гг.).

## СЛАЎНЫ СЫН СЛАВУТАГА ПОЛАЦКА

**Тэст-віктарына**

- На чым першыя «кнігадрукары» высякалі літары?
  1. Сцяне
  2. Дзервяне
  3. Камяні **(+)**

- Хто быў першым кнігадрукаром усходніх славян?
  1. Фёдараў
  2. Колас
  3. Скарына **(+)**

- Як звалі Скарыну?
  1. Ясь
  2. Бенедыкт
  3. Францыск **(+)**

- Дакладная дата нараджэння Францыска Скарыны невядома. Аднак, ва ўсім свеце прынята лічыць годам нараджэння:
  1. 1490 год **(+)**
  2. 1504 год
  3. 1517 год

- У якім горадзе нарадзіўся беларускі першадрукар?
  1. Нясвіжы
  2. Полацку **(+)**
  3. Мінску

- Скарына нарадзіўся ў сям'і
  1. Купца **(+)**
  2. Настаўніка
  3. Лекара?

- Як звалі бацьку Францыска Скарыны?
  1. Лука **(+)**
  2. Сімяон
  3. Бенедыкт

- Дзе вучыўся Францыск Скарына?
  1. Еўропе **(+)**

2. Азіі
3. Амерыцы

- У які ўніверсітэт паступіў Францыск Скарына?
  1. Маскоўскі
  2. Пражскі
  3. Кракаўскі **(+)**

- У якім годзе Скарына паступіў ва ўніверсітэт?
  1. 1504 **(+)**
  2. 1512
  3. 1517

- Якую вучоную ступень атрымаў Францыск Скарына ў Кракаўскім універсітэце?
  1. Доктара медыцыны
  2. Бакалаўра вольных мастацтваў **(+)**
  3. Астранома

- У якім горадзе Скарына атрымаў вучоную ступень доктара медыцыны?
  1. Рыме
  2. Фларэнцыі
  3. Падуі **(+)**

- Якую прафесію атрымаў Францыск Скарына?
  1. Доктара **(+)**
  2. Мастака
  3. Музыканта

- Як называлася першая кніга, надрукаваная Скарынам?
  1. Буквар
  2. Псалтыр **(+)**
  3. Каляндар

- Калі яна была выдадзена ?
  1. 1515
  2. 1517 **(+)**
  3. 1522

- У якім горадзе была надрукавана першая кніга?
  1. Мінску
  2. Празе **(+)**

3. Варшаве

- На якой мове была надрукавана першая кніга?
  1. Лацінскай
  2. Старабеларускай **(+)**
  3. Рускай

- У якім горадзе Францыск Скарына заснаваў друкарню?
  1. Полацку
  2. Мінску
  3. Вільні **(+)**

- Якія кнігі былі выдадзены Скарынам?
  1. Навуковыя
  2. Рэлігійныя **(+)**
  3. Гістарычныя

- Колькі кніг было выдадзена Скарынам?
  1. 20 кніг
  2. 23 кнігі
  3. 40 кніг
  4. 45 кніг
  5. Дакладна невядома **(+)**

- Якая дата лічыцца пачаткам беларускага кнігадрукавання?
  1. 1817 год
  2. 1517 год **(+)**
  3. 1617 год

- Кім працаваў Скарына ў чэшскага караля?
  1. Бібліятэкарам
  2. Садоўнікам **(+)**
  3. Перакладчыкам

- Які год лічыцца годам смерці Францыска Скарыны?
  1. 1551 **(+)**
  2. 1541
  3. 1545

- Што у сталіцы Беларусі названа у гонар Францыска Скарыны?
  1. Плошча
  2. Праспект **(+)**
  3. Тэатр

- Які музей адкрыты ў Полацку?
  1. Краязнаўчы музей
  2. Карцінная галерэя
  3. Музей беларускага кнігадрукавання **(+)**

## АД КНІГІ РУКАПІСНАЙ – ДА ДРУКАВАНАЙ

### Тэст-віктарына

Кніга – сапраўды геніяльнае адкрыццё чалавецтва. Яна належыць да тых вынаходніцваў, якія не маюць сабе роўных. Уся гісторыя чалавецтва адлюстроўвалася ў кнізе. Многія матэрыялы: камень, гліну, папірус, скуру, выкарыстоўваў чалавек для вырабу кніг, пакуль не спыніўся на паперы.

Беларускае кнігадрукаванне прайшло доўгі і цяжкі шлях. Уплыў выданняў Францыска Скарыны на развіццё беларускага і ўвогуле еўрапейскага друку быў надзвычай вялікі. Да 1596 года на Беларусі і за яе межамі для беларусаў было выдадзена каля 400 кніг, больш за чвэрць з іх надрукавана кірылічным шрыфтам. У Расіі на той час выйшла нямногім больш за 10 выданняў, на Украіне – каля 30.

Прапануем Вам адказаць на пытанні віктарыны і прадэманстраваць свае веды гісторыі кнігадрукавання.

- Вынаходніцтва друкарскага станка з'явілася адным з найвялікшых адкрыццяў эпохі Адраджэння. Каму належыць гэтае вынаходніцтва?
  1. Францыску Скарыне
  2. Іагану Гутэнбергу **(+)**
  3. Альду Мануцыю

- Вядома, што Францыск Скарына ў 1517 годзе выдаў першую кнігу на тагачаснай беларускай мове. Гэта –
  1. «Біблія», г. Прага
  2. «Псалтыр», г. Кракаў
  3. «Псалтыр», г. Прага **(+)**

- Свае выданні Францыск Скарына ўпрыгожваў:
  1. Ксілаграфіямі **(+)**
  2. Медальёнамі
  3. Выцінанкамі

- У пражскіх выданнях Скарына двойчы выкарыстаў кінавар: у кнізе «Песня песням» і «Бібліі». Кінавар – гэта…

1. мінеральная фарба чырвонага колеру **(+)**
2. гравюра-мініяцюра
3. ілюстрацыя

- Да нашага часу дайшоў гравіраваны партрэт Францыска Скарыны. У якой кнізе і ў якім годзе ён быў адбіты?
  1. 1519 год, «Быццё» **(+)**
  2. 1517 год, «Псалтыр»
  3. 1522 год, «Малая падародная кніжыца»

- Пасля Скарыны кірылічнае кнігадрукаванне развіваў Сымон Будны. Ён заснаваў на сучаснай тэрыторыі Беларусі першую друкарню, і ў 1562 годзе ў друкарні выйшла першая кніга на беларускай мове. Гэта –
  1. «Катэхізіс», г. Нясвіж **(+)**
  2. «Біблія», г. Лоск
  3. «Евангелле», г. Полацк

- Пры сваёй друкарні Сымон Будны пабудаваў паперню. Паперня – гэта…
  1. майстэрня па вытворчасці паперы **(+)**
  2. бібліятэка-чытальня
  3. крама, дзе прадаваліся кнігі

- Загалоўныя літары павялічанага памеру, ініцыялы, Францыск Скарына аздабляў малюнкамі пладоў, кветак, рыб, птушак, звяроў, людзей. Гэтую ж традыцыю пераняў і Сымон Будны. Які быў яго фірменны ініцыял?
  1. Дубовы лісток на тонкай галінцы **(+)**
  2. Выявы птушак
  3. Беларускі народны арнамент

- Васіль Цяпінскі праславіўся тым, што выдаў «Евангелле», гэтае выданне вельмі рэдкае, да нашага часу дайшлі адзінкавыя экзэмпляры. Адметнасцю дадзенага «Евангелля» з’яўляецца наяўнасць 210 глосаў. Цяпінскі працягнуў скарынаўскую традыцыю. Глосы – гэта…
  1. песні, якія ўключаліся ў асноўны тэкст кнігі
  2. тлумачэнне або пераклад незразумелага слова на палях ці паміж радкамі рукапіснай або старадрукаванай кнігі **(+)**
  3. спасылкі на раздзелы або часткі «Бібліі»

- Друкарня Мамонічаў першая ў беларускім кнігадрукаванні пачала выпускаць кірылічныя кнігі прававога характару. У 1586 годзе Мамонічам было даручана надрукаваць першае афіцыйнае выданне – «Трыбунал», крыху пазней выпусцілі яшчэ больш важнае выданне – …

1. «Статут Вялікага Княства Літоўскага», 1588 г. **(+)**
2. «Зборнік павучанняў», 1585 г.
3. «Судзебнік», 1588 г.

- Да другой паловы 17 стагоддзя адносіцца дзейнасць Самуіла Гаўрылавіча Пятроўскага-Сітняновіча, які нарадзіўся ў 1629 годзе ў Полацку. Мяркуюць, што ён быў настаўнікам Пятра I, для якога выдаў «Букварь» у Верхняй друкарні ў Крамлі. Пра каго ідзе гаворка?
  1. Лаўрэнцій Зізаній
  2. Сімяон Полацкі **(+)**
  3. Ілья Капіевіч

- Кірылічныя шрыфты для выданняў Ільі Капіевіча былі створаны на аснове формы літар скарынаўскіх кніг. У 1707 годзе пад яго кіраўніцтвам быў адліты новы шрыфт, які адыграў важную ролю ў друкарскай справе і распаўсюджанні кніг. Ён атрымаў назву –...
  1. грамадзянскі шрыфт**(+)**
  2. буквіца
  3. цыцэра

- У 1775 – 1802 гадах у Гродне дзейнічала «Каралеўская друкарня», у якой было выдадзена каля 100 кніг арыгінальнай і перакладной літаратуры. Значны даход прыносіў выраб падручнікаў, польскіх і лацінскіх малітвеннікаў, абʼяў, рэкламных праспектаў. Такіх выданняў выйшла каля 240. Хто быў уладальнікам друкарні?
  1. Антоні Тызенгаўз **(+)**
  2. Жан Эмануэль Жылібер
  3. Міхаіл Агінскі

- У другой палове 18 стагоддзя на Беларусі з’явіліся першыя перыядычныя выданні. Гродна стаў трэцім горадам Рэчы Паспалітай (пасля Варшавы і Вільні), дзе выходзіла сваё перыядычнае выданне –
  1. «Каляндар гаспадарчы»
  2. «Газета Гродзеньска» **(+)**
  3. «Навіны Гародні»

- Выданне ў выглядзе блока замацаваных у карашку аркушаў друкаванага матэрыялу любога фармату ў вокладцы або пераплёце, аб’ём якога больш за 48 старонак – гэта:
  1. брашура
  2. кніга **(+)**

**3.** том

## ФРАНЦЫСК СКАРЫНА

### Крыжаванка






## Пытанні да крыжаванкі:

**1.** Імя першай жанчыны – перапісчыцы кніг? (Еўфрасіння)

**2.** Малюнак вадзянымі фарбамі па свежай тынкоўцы? (Фрэска)

**3.** Які горад у летапісах узгадваецца пад 862 годам? (Полацк)

**4.** Імя дойліда, які ў 12 стагоддзі пабудаваў Спаса–Еўфрасінеўскую царкву ў Полацку. (Іаан)

**5.** Багаты апякун навук і мастацтваў? (Мецэнат)

**6.** Якія плямёны жылі на тэрыторыі сучаснай Полаччыны? (Крывічы)

**7.** Запіс падзей па гадах? (Летапіс)

**8.** Жывапісная выява Ісуса Хрыста, святых? (Ікона)

**9.** Сабораў з такой назвай тры, яны знаходзяцца ў Полацку, Ноўгардзе, Кіеве? (Сафійскі)

**10.** Прозвішча майстра, які зрабіў копію крыжа Еўфрасінні Полацкай? (Кузьміч)

**11.** Прозвішча майстра–ювеліра, які зрабіў у 1161 годзе крыж для Еўфрасінні Полацкай? (Богша)

**12.** Вялікі славянскі асветнік 9 стагоддзя, які стварыў азбуку? (Кірыла)

**13.** Апавяданне пра жыццё і дзейнасць святых? (Жыціе)

**14.** Праз якую раку прахадзіў шлях «з вараг у грэкі»? (Дзвіна)

**15.** Ад назвы якой ракі пайшла назва горада Полацка? (Палата)

## НАЗВЫ ВЫСТАЎ І МЕРАПРЫЕМСТВАЎ ДА 500-ГОДДЗЯ БЕЛАРУСКАГА КНІГАДРУКАВАННЯ

«Ад кнігі рукапіснай – да друкаванай»

«Ад Полацка пачаўся свет»

«Ад Францыска Скарыны – першыя кнігі»

«Вехі кнігадрукавання»

«Вечныя дарогі і нястомныя пошукі Францыска Скарыны»

«Выдадзена Скарынам»

«Вялікі пачынальнік»

«Вялікі сын Полацкай зямлі»

«Вяртанне праз стагоддзі»

«Гімн пісьменству з далёкіх часоў»

«Гістарычная памяць народа: з мінулага ў будучыню»

«Гісторыя беларускай кнігі»

«Гісторыя роднага слова»

«Дакрананне да мудрасці стагоддзяў»

«Дакрануцца да гісторыі»

«Дарога да беларускага слова»

«Дарогамі Францыска Скарыны»

«Духоўная спадчына Францыска Скарыны і сучаснасць»

«З любоўю да свайго народа»

«Знакамітаму земляку прысвячаецца»

«І будзе слова земляка гучаць над роднаю старонкай»

«І вечным застанецца слова»

«Імя і справа Францыска Скарыны»

«Каб не зніклі веды»

«Кніжная культура Беларусі»

«Кніжная спадчына»

«Кніжную мудрасць ён нёс для людзей»

«Людзям паспалітым для добрага навучання»
«Мастацтва беларускага друку»
«Неўміручы свет Скарыны»
«Пачатае Скарынам»
«Покліч мінулага»
«Пра мінулае – для будучыні»
«Прысвячэнне роднаму слову»
«Са слаўнага Полацка родам»
«Са спадчыны продкаў – у будучыню»
«Светач беларускага народа»
«Свет Скарынавай кнігі»
«Святло друкаванага слова»
«Скарына і яго эпоха»
«Слава вялікаму майстру»
«Славуты майстар кнігадруку»
«Славуты сын Беларусі»
«Славуты сын эпохі Адраджэння»
«Слова жывое: шляхам асветніцтва і дабрыні»
«Спадчына Францыска Скарыны»
«Спадчына Скарыны – нацыянальны здабытак Беларусі»
«Сын слаўнага горада Полацка»
«Таямніцы старадрукаў»
«Францыск Скарына: вядомы і незнаёмы»
«Францыск Скарына – вялікі беларус»
«Францыск Скарына – духоўна –асветніцкі сімвал Беларусі»
«Францыск Скарына – першадрукар, асветнік, гуманіст»
«Францыск Скарына – шлях служэння Радзіме і народу»
«Шляхам асветніка Скарыны»
«Шлях да святыняў і беларускага слова»
«Я, Францішак Скарына…»

## ЛАЎРЭАТЫ КОНКУРСАЎ І ПРЭМІЙ

### Кнігі–лаўрэаты 56-га Нацыянальнага конкурсу «Мастацтва кнігі – 2017»

### Пераможцы ў намінацыях:

**«Трыумф» – Гран-пры** – шматтомнае факсімільнае выданне «Кніжная спадчына Францыска Скарыны»;

**«Першадрук»** (да 500-годдзя беларускага кнігадрукавання) – выданне А. Цітова «Шляхамі Францыска Скарыны»;

**«Духоўнасць»** – выданне «Спасская церковь Евфросиниевского монастыря в Полоцке»;

**«За ўклад у захаванне духоўнай спадчыны»** – кніга «Песні пакінутых вёсак»;

**«Залатыя скрыжалі»** – энцыклапедычны даведнік з аўдыядадаткам «Беларускія народныя музычныя інструменты»;

**«У люстэрку часу»** – кніга «Милиция Беларуси: 100 лет. На службе закону, народу, Отчизне»;

**«ЛІТ-фармат»** – пераможца не вызначаны;

**«Фотапогляд»** – альбом да 950-годдзя горада Мінска «Минск. Проспект Независимости»;

**«Існасць рэчаў»** (за ўклад у захаванне матэрыяльнай спадчыны) – даведнік «Тутэйшы дызайн. Асобы. Рэчы»;

**«АРТ-кніга»** – выданне А. В. Зінкевіча «Беларускі нацюрморт. 1960–2010»;

**«Эўрыка»** – навуковае выданне «Битва у Нарочи, 1916. Немецкие источники о русском весеннем наступлении»;

**«Разам з кнігай мы расцём»** – кніга А. Пісьмянкова «Чаму вожык не стрыжэцца?»;

**«Падручнік новага стагоддзя»** – дапаможнік для настаўнікаў «Географический атлас учителя»;

**«Садружнасць»** – ілюстраванае выданне А.А. Сушы «Франциск Скорина – человек мира»;

**«Майстэрства»** – лепшым ілюстратарам кнігі названы Павел Татарнікаў за цыкл ілюстрацый да кнігі У. Арлова «Айчына: маляўнічая гісторыя. Ад Рагнеды да Касцюшкі»; лепшым дызайнерам – Дзяніс Раманюк за кнігі «Чарнобыль», «Беларускія народныя строі», «Беларусь сінявокая», «Беларускія народныя крыжы», «Мой шлях Беларусь», «Игорь Бархатков». У намінацыі «Лепшы фотамастак» пераможца не вызначаны.

## Лаўрэаты 2-й Нацыянальнай літаратурнай прэміі

### Пераможцы ў намінацыях:

**«Лепшы твор паэзіі»** – Мар'ян Дукса за кнігу «Птушка вечнасці – душа»;

**«Лепшы твор прозы»** – Алесь Марціновіч за зборнік гістарычных апавяданняў «Цяпло колішніх вогнішчаў»;

**«Лепшы твор драматургіі»** – Ягор Конеў за п'есу «Злачынства і пакаранне на берагах Свіслачы»;

**«Лепшы твор публіцыстыкі»** – Мікалай Барысенка за кнігу «Рэха вайны ва Усходняй Беларусі»

**«Лепшы твор літаратурнай крытыкі і літаратуразнаўства»** – Таццяна Мацюхіна за навуковае выданне «Беларускі імпрэсіянізм»;

**«Лепшы твор для дзяцей і юнацтва»** – Сяргей Давідовіч за кнігі «Дзедава жалейка», «Баявая нічыя, «Залаты буліт»;

**«Лепшы дэбют»** – Сяргей Клімковіч за кнігу «Тайна кватэры № 8», дзіцячыя творы ў чатырох тамах.

## Лаўрэаты штогадовай літаратурнай прэміі «Адкрыццё года»

Экспертны савет Мінскага гарадскога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі падвёў вынікі штогадовага творчага конкурсу сярод маладых літаратараў на прысуджэнне літаратурнай прэміі МГА СПБ «Адкрыццё года» за 2016 год. На разгляд савета былі вылучаны творы 7-мі юных празаікаў, паэтаў і публіцыстаў г. Мінска. Лаўрэатамі прэміі сталічнай пісьменніцкай арганізацыі сталі студэнтка філалагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта **Кацярына Роўда** і студэнтка Інстытута тэалогіі

гэтага ж універсітэта **Кацярына Стройлава**. Член СПБ К. Роўда адзначана за кнігу вершаў «Водар белага наліву», а кандыдат у члены СПБ К. Стройлава – за кнігу вершаў «Тернистый путь».

Кнігі маладых паэтак выдадзены ў кніжнай серыі МГА СПБ «Мінскія маладыя галасы». Урачыстая цырымонія ўручэння літаратурнай прэміі адбылася ў літаратурным клубе «Парнас», які працуе пры публічнай бібліятэцы № 5.

## Лаўрэаты літаратурнай прэміі імя Кірылы Тураўскага

Пераможцы за 2016 год былі ўганараваны ў верасні на галоўнай сцэне Дня беларускага пісьменства ў Рагачове. Гэта пісьменнікі: Міхась Болсун (паэзія), Алег Ананнеў (публіцыстыка), Яўген Калашнікаў (дзіцячая літаратура), а таксама Алена Асенчык (намінацыя "Адкрыццё года", паэзія) за кнігі, якія выйшлі ў мазырскім выдавецтве "Калор".

## СЦЭНАРНЫЯ І МЕТАДЫЧНЫЯ МАТЭРЫЯЛЫ ДА СВЯТКАВАННЯ 500-ГОДДЗЯ БЕЛАРУСКАГА КНІГАДРУКАВАННЯ


**1.** Агіевіч, У. Сімволіка гравюры Скарыны / У. У. Агіевіч. – Мінск : Беларуская навука, 1999. – 318, [2] с.

**2.** Александровіч, С. Тут зямля такая : [нарысы] / Сцяпан Александровіч. – 2-е выд., дапрацаванае і дапоўненае. – Мінск : Народная асвета, 1985. – 255с.

**3.** Арочка, М. Судны дзень Скарыны : [драматычная паэма] / Мікола Арочка ; [мастак М. Купава]. – Мінск : Мастацкая літаратура, 1991. – 166, [1] с.

**4.** Клышка, А. Францыск Скарына, альбо Як да нас прыйшла кніга : [для малодшага і сярэдняга школьнага ўзросту] / Анатоль Клышка. – Мінск : Беларусь, 2016. – 125 с., [37] л. факсім.

**5.** Лойка, А. Францыск Скарына, або Сонца Маладзіковае : [раман-эсэ] / А. А. Лойка. – Мінск : Мастацкая літаратура, 2009. – 366 с.

* * *

**1.** 525 гадоў з дня нараджэння Ф. Скарыны (1490? – 1551?), першадрукара, асветніка-гуманіста, пісьменніка, грамадскага дзеяча, мастака-графіка, медыка, батаніка і астранома // Дадатак да Новых кніг. – 2015. – № 5. – С. 3–8.

**2.** Акушэвіч А. Біблейская аснова ў вершатворчасці Францыска Скарыны / Андрэй Акушэвіч // Роднае слова. – 2015 . – № 4. – С. 21 – 24.

**3.** Акушэвіч, А. Выслоўе Францыска Скарыны «Понеже...» : структура, рэцэпцыя і пераклад / А. А. Акушэвіч // Беларуская мова і літаратура. – 2015. – № 9. – С. 55 – 60.

**4.** Аўдоніна, Т. Францыск Скарына: шлях служэня Радзіме і народу / Т. Аўдоніна // Роднае слова. – 2013. – № 5. – С. 20 – 22.

**5.** Бартасевіч, Л. Калейдаскоп праектных спраў : [вопыт работы полацкіх бібліятэкараў] / Бартасевіч Л. // Бібліятэка прапануе. – 2017. – № 3. – С. 12 – 14.

**6.** Варанько, К. Графіка-арфаграфічныя асаблівасці кніг «Руф» і «Суддзі» Францыска Скарыны / К. Варанько // Роднае слова. – 2012. – № 7. – С. 40 – 43.

**7.** Варанько, К. Да 525-годдзя з дня нараджэння Ф. Скарыны (1490 ?– 1551?) / К. Д. Варанько // Адукацыя і выхаванне. – 2015. – № 9. – С. 72 – 75.

**8.** Данілішына, А. Вытокі беларускага пісьменства : інтэлектуальны аўкцыён / А. Данілішына // Роднае слова. – 2015. – №8. – С. 69 – 72.

**9.** Драган, А. Скарынаву кнігу ў вечнасць пусціць: сцэнарны матэрыял літаратурна-музычнага свята краязнаўчай кнігі / А. Драган // Гучы, родная мова!. – Мінск: Красіка-Прынт, 2016. – С. 19 – 27. – (Бібліятэка прапануе).

**10.** Дзяменцій, Л. Сем цудаў Беларусі: Біблія Францыска Скарыны / Л.В. Дзяменцій // Беларуская мова і літаратура. – 2016. – № 4. – С. 21 – 23.

**11.** Дубянецкая, Г. Кніга роду: новая беларуская Біблія [Францыска Скарыны] / Галіна Дубянецкая // Дзеяслоў. – 2017. – № 1. – С. 5 –14.

**12.** Калужонок, Н. Книжное королевство на Скариновских днях в Полоцке / Н. Калужонок // Форум бібліятэкараў Беларусі. – Мінск: Красіка-Прынт, 2016. – С. 32 – 34. – (Бібліятэка прапануе).

**13.** Клімаў, І. Асветніцкія і духоўныя традыцыі Скарынавай кнігі / Ігар Клімаў // Маладосць. – 2017. – № 1. – С. 144 –150.

**14.** Клышка, А. Францыск Скарына, альбо Як да нас прыйшла кніга : [старонкі, эпізоды з аповесці] / Анатоль Клышка // Вясёлка. – 2017. – № 3. – С. 10.

**15.** Лаўрэнава, Л. Францыск Скарына : інфармацыйная гадзіна / Л. Лаўрэнава // Гучы, родная мова! / склад. : Л. І. Макаранка, В. А. Тамашова. – Мінск: Красіка-Прынт, 2016. – С. 28 – 30. – (Бібліятэка прапануе).

**16.** Марціновіч, Д. Скарына вяртаецца / Д. Марціновіч // Літаратура і мастацтва. – 2012. – 25 мая. – С. 21.

**17.** Мілянтынава, Т. Францыск Скарына – першадрукар, асветнік, гуманіст / Мілянтынава, Т., Ладзята Ж. // Бібліятэка прапануе. – 2017. – № 3. – С. 2 – 6.

**18.** Праз смугу стагоддзяў дайшло да нас слова : літаратурна-музычная кампазіцыя да Дня беларускага пісьменства // Бібліятэка прапануе . – 2001 . – № 2. – С. 24 – 25.

**19.** Суша, А. Спадчына Скарыны: якія захады трэба зрабіць? / А. Суша // Культура. – 2014. – 21 чэрвеня – С. 5.

**20.** Суша, А. Франциск Скорина. Новое прочтение / А. Суша ; беседовала Л. Тимошик // Звязда. – 2015. – 7 ліпеня – С. 11.

**21.** Чамярыцкі, В. Загадкавыя кніжныя знакі Францыска Скарыны / В. Чамярыцкі // Роднае слова. – 2016. – № 7. – С. 3 – 6.

**22.** Шарапаў, У. Рэнесансавая культура ў ВКЛ у першай палове XVI ст. : сцэнарый літаратурнага ўрока / Улядзіслаў Шарапаў // Беларускі гістарычны часопіс. – 2017. – № 2. – С.47 – 53.

**23.** Шимолин, В. Франциск Скорина: московский след / В. Шимолин // Беларуская думка. – 2016. – № 3. – С. 86 – 91.

## МАТЭРЫЯЛЫ ПРА СЁЛЕТНЮЮ СТАЛІЦУ СВЯТА БЕЛАРУСКАГА ПІСЬМЕНСТВА

**1.** Геращенко, А. Очерки по истории Полоцка и Белой Руси / Андрей Геращенко. – Минск : Ковчег, 2013. – 192 с.

**2.** Полацк музейны : фотаальбом / аўтар-уклад. Т. А. Джумантаева, М. М. Ільніцкі; фота І. У. Супранёнка. – Мінск : Беларусь, 2006. – 283 с.

**3.** Полацк, які мы любім : фотаальбом / уклад. С. У. Пешын. – Мінск : Беларусь, 2006. – 130 с.

**4.** Полоцк : [Полоцк и Полоцкое княжество (земля) в IX-XIII в.в., летопись древних слоев, Полоцк и его округа в XIV-XVIII вв., ремесло, денежноеобращение и торговые связи Полоцка в средневековье (по данным археологии, нумизматики и письменных источников), культура и просвещение в средневековом Полоцке] / науч. ред. О. Н. Левко. – Минск : Беларуская навука, 2012. – 743 с. – ( Древнейшие города Беларуси).

**5.** Селицкий, А. Евфросиния Полоцкая : ее храм, ее фрески / А. А. Селицкий. – Минск : Беларусь, 2016. – 180, [3] с.

**6.** Черемин, А. Полоцкое княжество (IX-XIV века) / Александр Александрович Черемин. – Минск : Белорусский Дом печати, 2013. – 272 с.

* * *

**1.** Археолагі ўдакладнілі біяграфію Полацка // Беларусь. – 2012. – № 3. – С. 26 – 27.

**2.** Асіноўскі, С. «... Людзям чыніў суды, радзіў князям гарады» // Архівы і справаводства. – 2012. – № 3. – С. 141 – 152.

**3.** Вакулік, А. Полацк – горад-музей: завочнае падарожжа для вучняў V-VII класаў / А. Г. Вакулік // Беларуская мова і літаратура. – 2016. – № 12. – С. 57 – 61.

**4.** Васючэнка, П. Палачане: [успаміны пра горад Полацк] // Маладосць. – 2012. – № 5. – С. 100 – 106.

**5.** В самом центре Европы: географический центр Европы находится в 48 километрах к юго-западу от Полоцка // Родная прырода. – 2014. – № 6. – С. 31.

**6.** Галоўка, С. Полацкі напрамак: як у 1944 годзе вызвалялі Полацк / Сяргей Галоўка // Беларуская думка. – 2015. – № 10. – С. 54 –61.

**7.** Гамзовіч, Р. Музей беларускага кнігадрукавання ў Полацку// Алеся. – 2012. – № 6. – С. 22 – 23.

**8.** Гамзовіч, Р. Полацк. Ад пачатку да нашага часу // Алеся. – 2012. – № 6. – С. 16 – 19.

**9.** Даніловіч, В. Полацк у гісторыі і культуры Еўропы : [да 1150-годдзя Полацка] // Беларускі гістарычны часопіс. – 2012. – № 6. – С. 77 – 78.

**10.** Дук, Д. Полацк і Полацкая зямля ў 9-10 стагоддзях : вытокі беларускай дзяржаўнасці // Беларускі гістарычны часопіс. – 2013. – № 11. – С. 5 – 9.

**11.** Дук, Д. Полацк IX-XI стагоддзяў : шлях да дзяржаўнасці : [да 1150-годдзя Полацка] // Беларускі гістарычны часопіс. – 2012. –№ 5. – С. 4 – 8.

**12.** Жлутка, А. Полацк і выправы на ўсход у «Дзеях данаў» Сакса Граматыка // Беларускі гістарычны часопіс. – 2012. – № 10. – С. 3 – 9.

**13.** Каваленя, А. Калыска беларускай дзяржаўнасці : [Полацку – 1150 гадоў] // Полымя. – 2012. – № 5. – С. 116 –122.

**14.** Калечыц, І. Графіці на слупах Полацкай Спаса-Прэабражэнскай царквы : [да 1150-годдзя Полацка] // Беларускі гістарычны часопіс. – 2012. – № 5. – С. 32 – 37.

**15.** Калечыц, І. Новыя знаходкі графіці ў Полацкай Спаса-Праабражэнскай царкве: аб месцазнаходжанні кліраса, эклезіоніме «Святы Спас» і гарадзецкім архімандрыце Іаане / Іна Калечыц // Беларускі гістарычны часопіс. – 2014. – № 7. – С. 37 – 40.

**16.** Лабоха, Г. Кароткі нарыс гісторыі Спаса-Ефрасіннеўскага жаночага манастыра ў Полацку // Беларускі гістарычны часопіс. – 2012. – № 10. – С. 19 – 29.

**17.** Легендарные полочане : [для младшего школьного возраста] / сост. Н. Я. Гальперович, А. Е. Геращенко. – Минск : Беларуская Энцыклапедыя імя Пятруся Броўкі, 2012. – 16 с.

**18.** Мотульский, Р. С. По следам книжных сокровищ: о библиотеке Полоцкого Софийского собора / Роман Мотульский // Беларуская думка. – 2016. – № 9. – С. 81– 85.

**19.** Рублеўская, Л. Далягляды старажытнага горада : [Полацк] // Беларусь. – 2012. – № 6. – С. 38 – 40.

**20.** Рутич, Г. Полоцкое княжество в IX-XI вв. / Галина Рутич // Планета. – 2014. – № 3. – С. 64 –70.

**21.** Семенюга, Т. О чём говорят камни: о гигантских валунах, которые сохранились со времён Полоцкого княжества / Татьяна Семенюга // Планета. – 2014. – №5. – С. 68 – 75.

**22.** Семенюга Т. Три Софии. Загадки собора над Двиной / Татьяна Семенюга // Планета. – 2014 . – № 11. – С. 48 – 55.

**23.** Содаль-Садэльскі, Ул. Першая беларуская кнігарня ў Полацку : [да 1150-годдзя горада Полацка] // Маладосць. – 2012. – № 5. – С. 107 – 108.

**24.** Суша, А. Бібліятэкі ў адукацыйнай прасторы даўняга Полацка : [да 1150-годдзя Полацка] // Беларускі гістарычны часопіс. – 2012. – № 5. – С. 38 – 46.

**25.** Тарасаў, С. Старажытны Полацк : балканскі след : [да 1150-годдзя Полацка] // Беларускі гістарычны часопіс. – 2012. – № 5. – С. 9 – 19.

**26.** Філіповіч, М. Полацкая зямля ў беларуска-літоўскай летапіснай традыцыі : балканскі след : [да 1150-годдзя Полацка] // Беларускі гістарычны часопіс. – 2012. – № 5. – С. 20 – 31.

**27.** Шашэнька, Н. Там, дзе вежы Сафіі : [Полацк] // Адукацыя і выхаванне. – 2012. – № 5. – С. 67 – 71.

## МАТЭРЫЯЛЫ ПРА ГІСТОРЫЮ І СУЧАСНЫ СТАН БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ

**1.** Беларуская літаратура : дадатковае чытанне / Нацыянальная акадэмія навук Беларусі ; [укладальнікі : С. А. Курбанава і і нш.]. – Мінск : Беларуская навука, 2016. – 358, [1] с.

**2.** Бязлепкіна, А. 100 слоў пра сучасную беларускую літаратуру : [даведнік] / Аксана Бязлепкіна. – Мінск : Лімарыус, 2012. – 223 с.

**3.** Карлюкевіч, А. Літаратурнае пабрацімства. Беларусь – Туркменістан : [сустрэчы, знаёмствы, адкрыцці] / Алесь Карлюкевіч. – Мінск : Звязда, 2016. – 190, [1] с.

**4.** Пяткевіч, А. Слова і кніга Прынёмання : [зборнік артыкулаў] / А. М. Пяткевіч. – Гродна : ЮрСаПрынт, 2016. – 207 с.

**5.** Скрозь «Маладосць» : не самая сумная кніжка пра грошы, чорны шакалад, пісьменнікаў і літаратуру / [укладальнік С. Дзянісава]. – Мінск : Звязда, 2013. – 270, [1] с., [16] л. іл.. – (Бібліятэка часопіса «Маладосць»).

* * *

**1.** Алейченко, Ю. Я не боюсь : современная белорусская проза / Юлия Алейченко // Нёман. – 2016. – № 3. – С. 169 – 182.

**2.** Ананьева, С. Диалог культур новейшего времени : белорусско-казахские литературные связи / Светлана Ананьева, Александр Карлюкевич // Беларуская думка. – 2015. – № 10. – С. 92 – 97.

**3.** Беларуска-ўкраінскія літаратурныя сувязі : гісторыя, сучаснасць, перспектывы // Полымя. – 2016. – № 5. – С. 173 –178.

**4.** Бельскі, А. «...Запісы для сябе і гісторыі» : дзённікі сучасных беларускіх паэтаў: традыцыйнае і наватарскае / Алесь Бельскі // Роднае слова. – 2016. – № 2. – С. 21 – 24.

**5.** Васючэнка, П. Утопія ці антыўтопія? Жанравы рух беларускай літаратуры XX-XXI стагоддзяў : [эсэ] / Пятро Васючэнка // Дзеяслоў. – 2016. – № 3. – С. 254 –261.

**6.** Вострыкава, А. Новыя ракурсы даследавання літаратурнай класікі / Алена Вострыкава // Роднае слова . – 2016. – № 7. – С. 19 – 21.

**7.** Гаранін, С. Сучаснае літаратуразнаўства : дыягназ і лекі : [да 85-годдзя Нацыянальнай Акадэміі навук Беларусі] // Літаратура і мастацтва. – 2014. – 24 студзеня (№ 4). – С. 6.

**8.** Соколовская, Е. Андрей Жвалевский и Евгения Пастернак «Гимназия № 13» : [о фантастическом произведении писателей] / Екатерина Соколовская // Волшебный. – 2016 . – № 22. – С. 2

## ЗМЕСТ


Ад Полацка пачаўся свет 2

Гістарычная памяць народа 4

Постаці далёкай мінуўшчыны:
помнікі беларускім асветнікам у Полацку 9

Ён першы кнігу даў славянам 12

Кніжную мудрасць ён нёс для людзей:
філасофскія і эстэтычныя погляды Францыска Скарыны 17

Прысвячэнне роднаму слову:
мова выданняў Францыска Скарыны 19

Мастацтва Скарынавай кнігі:
аздабленне выданняў 20

Напісанае застаецца:
афарызмы і цытаты Францыска Скарыны 23

Кніжная спадчына:
выдадзена Францыскам Скарынам 25

Формы інфармацыйна-масавых мерапрыемстваў
з нагода святкавання 500-годдзя беларускага кнігадрукавання 30

Слаўны сын славутага Полацка: тэст-віктарына 32

Ад кнігі рукапіснай – да друкаванай: тэст- віктарына
35

Францыск Скарына: крыжаванка 38

Назвы выстаў і мерапрыемстваў
да 500-годдзя беларускага кнігадрукавання 40

Лаўрэаты конкурсаў і прэмій 42

Кнігі–лаўрэаты 56-га Нацыянальнага конкурсу
«Мастацтва кнігі – 2017» 42

Лаўрэаты 2-й Нацыянальнай літаратурнай прэміі 43

Лаўрэаты штогадовай літаратурнай прэміі «Адкрыццё года» 43

Лаўрэаты літаратурнай прэміі імя Кірылы Тураўскага 44

Сцэнарныя і метадычныя матэрыялы
да святкавання 500-годдзя беларускага кнігадрукавання 44

Матэрыялы пра сёлетнюю сталіцу
свята беларускага пісьменства 46

Матэрыялы пра гісторыю і

# ЁН ПЕРШЫ КНІГУ ДАЎ СЛАВЯНАМ

метадычныя парады ў дапамогу арганізацыі мерапрыемстваў
да 500-годдзя беларускага кнігадрукавання


Укладальнік А.С. Рубель

Рэдактар Н.Ю. Наземцава

Адказны за выпуск М.А. Камарова